КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №28 (156)
◂ 14 ЖНІЎНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



## А ІДЗІЦЕ ВЫ Ў ЛАЗНЮ!

Палітолаг Сяргей Нікалюк аб спосабах выжывання насельніцтва ў новых умовах

Стар. 4

## Ігар Пастухоў: «АДНО З ДВУХ — ЦІ АЭС, ЦІ ЗАКАЗНІК»

Яшчэ на пачатку ліпеня Ігар Пастухоў, дырэктар ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры», звярнуўся ў Савет міністраў з заклікам не будаваць АЭС паблізу ад ахоўных прыродных тэрыторый. Праз некалькі тыдняў Ігара Пастухова звольнілі

Стар. 6

## КАНЦЭРТ, ЯКІ ЗРАБІЎ АБАМУ ПРЭЗІДЭНТАМ

Стар. 11

## ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

Яшчэ больш доўгімі, чым жыццё чалавека, бываюць дарогі вяртання помнікаў гісторыі і культуры

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Нарыс Аляксея Хадыкі**

## Таямніца Віленскай катэдры

**З цыклу «Таямніцы беларускай гісторыі»**

▸ СМІ

# ЛЕПШ, ЧЫМ МАГЛО БЫЦЬ, АЛЕ ГОРШ, ЧЫМ МУСІЦЬ

Генадзь КЕСНЕР

**Прайшло паўгода з моманту ўступлення ў сілу новага Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі». Эксперты ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» падсумавалі вынікі дзеяння гэтага заканадаўчага акта і прыйшлі да высновы, што прынцыпова ўмовы дзейнасці незалежных СМІ ў Беларусі пасля з'яўлення гэтага дакумента не змяніліся.**




«Экспрэсія». Мастак Карлас Аляксандра Фалька Чанг (Куба)

Варта адзначыць, што дагэтуль у сістэму падпіскі і распаўсюду не вернуты больш за дзесяць беларускіх грамадска-палітычных выданняў, у тым ліку і «Новы час».

Што да самога «мініюбіляра», то намеснік старшыні БАЖ Андрэй Бастунец нагадаў, што эксперты Беларускай асацыяцыі журналістаў яшчэ да прыняцця дакумента крытыкавалі як сам закон у цэлым, так і асобныя яго палажэнні. «Сфера дзейнасці закона была адным з пунктаў, якія выклікаў найбольшую крытыку, а менавіта тое, што закон закранае тыя СМІ, якія распаўсюджваюцца ў сусветным павуцінні — інтэрнэце», — адзначыў падчас прэс-канферэнцыі намеснік старшыні БАЖ.

Урад, згодна новага закона, мусіў стварыць адмысловую групу, што займалася б распрацоўкай спецыяльнага палажэння, якое б рэгулявала дзейнасць інтэрнэт-медыя. «Безумоўна, мы адзначаем як пазітыўны момант тое, што дзейнасць групы, якая распрацоўвала пастанову ўрада, прыпынена, і гэта пастанова дагэтуль не распрацавана», — сказаў Андрэй Бастунец.

Паводле яго слоў, яшчэ адным станоўчым момантам з'яўляюцца пэўныя крокі ўладаў па лібералізацыі падыходу да рэгістрацыі і перарэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі. Напрыклад, у старым законе была прапісана неабходнасць узгаднення размяшчэння СМІ з мясцовымі органамі ўлады, што стварала вялікія праблемы для дзейнасці недзяржаўных масмедыя, — у новым законе такое ўзгадненне не прадугледжана. «Мы бачым, што мае месца практыка адмовы ад штучных перашкодаў для стварэння новых сродкаў масавай інфармацыі», — адзначыў намеснік старшыні БАЖ.

Тым не менш, падкрэсліў юрыст, сам факт неабходнасці дзяржаўнай рэгістрацыі СМІ супярэчыць дэмакратычным падыходам. З іншага боку, пазітыўным ёсць тое, што цяпер перарэгістрацыя ўжо існуючых выданняў мае не дазвольны, а заяўны характар.

Як адзначаюць эксперты БАЖ, Міністэрства інфармацыі не злоўжывае сваімі надзвычай вялікімі паўнамоцтвамі па ўмяшанню ў дзейнасць СМІ. У 2006 годзе менавіта да гэтага заклікаў прадстаўнік АБСЕ па пытаннях сродкаў масавай інфармацыі Міклаш Харашці. Затое сваімі паўнамоцтвамі злоўжываюць пракуратура і некаторыя ідэолагі, асабліва калі справа тычыцца журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі медыямі. Даволі жорсткую пазіцыю займае і Міністэрства замежных спраў, прычым не звяртаецца ўвага на заклікі Еўрапейскага парламента і Савета Еўропы скасаваць перашкоды для акрэдытацыі карэспандэнтаў замежных СМІ і дзейнасці «Белсата», «Еўрарадыё», «Радыё Рацыя» ды некаторых іншых масмедыя.

Адмоўным з'яўляецца і тое, што новы закон «Аб СМІ» не забяспечыў доступу журналістаў да інфармацыі. Прававыя акты, што прымаюцца апошнім часам, як сцвярджаюць юрысты БАЖ, накіраваны на абмежаванне цыркулявання неадфільтраванай інфармацыі ў грамадстве. Практыка прымянення Закона «Аб СМІ» наўпрост залежыць ад узаемадачыненняў Беларусі з Еўропай. У выпадку пагаршэння гэтых стасункаў ці змянення вектару беларускай міжнароднай палітыкі гэты і іншыя законы лёгка могуць быць скіраваны супраць СМІ, лічаць юрысты БАЖ. Бо прававая база існавання СМІ ў Беларусі толькі пагоршылася, і сістэмных зрухаў наперад не адбылося. А ўлада, як і раней, імкнецца захаваць кантроль над інфармацыйнай прасторай Беларусі.

Як падсумаваў вынікі паўгадавога дзеяння дакумента Андрэй Бастунец, «усё, што адбывалася пасля прыняцця новага закона «Аб СМІ», — гэта лепш, чым магло быць, але горш, чым мусіць».

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ



### ПОЛАЦК. АДМЕТНЫ ПОМНІК

У полацкім мікрараёне «Аэрапорт» на пляцоўцы ля крамы «Фрыдрыхсхафэн» з'явіўся помнік, які ўяўляе сабой нішто іншае, як вагі. Адкрыццё яго адбылося на Дзень гандлю. Ідэя і эскіз помніка належаць намесніку старшыні Полацкага гарвыканкама Сяргею Куксаву. У сваёй прамове на цырымоніі адкрыцця Сяргей Рыгоравіч адзначыў, што сфера гандлю ў Полацку стабільна развіваецца. «Яшчэ ніводная галіна так дружна не ставіла перад сабой мэту ўвекавечыць знак сваёй працы, — падкрэсліў Сяргей Куксаў. — Я ўпэўнены, што ініцыятыву падхопяць і іншыя. Хутка будаўнікі сябе ўславяць падобнай выявай». Год таму, таксама ў Дзень гандлю, у Полацку была ўсталявана скульптура «Полацкі купец».

### УВАРАВІЧЫ. ЛЕНІН ЗАБІЎ ЧАЛАВЕКА

Падзенне помніка ў мястэчку Уваравічы стала прычынай гібелі 21-гадовага мясцовага жыхара. Няшчасны выпадак здарыўся раніцай 10 жніўня на тэрыторыі мясцовай школы, дзе ў альтанцы сустракала світанак моладзевая кампанія. Хлопец ускараскаўся на пастамент помніка Леніну (вышыня шэсць метраў) і паспрабаваў павіснуць на працягнутай уперад руцэ правадыра сусветнага пралетарыяту. У гэты момант і адбылося абрушванне цяжкай канструкцыі. Па дарозе ў Гомельскую абласную лякарню малады чалавек ад атрыманых траўмаў памёр.

### ПАСТАВЫ. ЕДЗЕМ НА ФЭСТ

Сёлетні фестываль балцкай культуры «Menuo Juodaragis» абяцае быць маштабным і адбудзецца, як заўжды, у Літве. Як сцвярджаюць арганізатары, у далейшым фэст, напэўна, будзе меншым па размаху. Беларусы, якіх цікавіць пост-фолк, традыцыйная культура, альтэрнатыўная музыка і агулам «балцкая тэма», заўжды прыхільна ставіліся да гэтай імпрэзы. Тры дні поўнага паглыблення ў балцкую праблематыку, зорныя ў сваіх стылях гурты — «Inkubus Sukkubus», «Irfan», «Of The Wand And The Moon», «Dandelion Wine», «Virre+», «Roma Amor», «Tylos» «Labanoro», «Bix», «Donis» і многія іншыя. У рамках фэсту пройдуць гульні, танцавальныя сэты і нават семінары. Сярод лектараў беларускі філосаф-традыцыяналіст Аляксей Дзермант, які прачытае лекцыю «Крывічы: славяне ці балты?». Фестываль пройдзе на выспе возера Зарасай з 28 па 30 жніўня.

### ВІЛЕЙКА. ЧОРНЫЯ КАПАЦЕЛІ

У раёне працягваюцца фіксавацца выпадкі вандалізму. Зараз пад удар іх патрапіў археалагічны помнік — Сцебурацкія камяні-валуны. Адзін з культавых камянёў зрушаны, а на яго месцы выкапана яма. Згодна з паданнем, Сцебурацкія камяні — гэта скамянелы араты і яго валы. Камяні размяшчаюцца на лініі поўдзень-поўнач і маюць выявы знакаў рун — крыжоў і рытонаў (рагоў). Гэта дазваляе казаць, што комплекс з'яўляецца даўнім святым месцам — капішчам. Пакуль невядома, якім чынам адрэагуюць на гэтае чарговае злачынства праваахоўныя органы: будзе весціся расследаванне ці парушэнне заканадаўства будзе зноў праігнаравана, як у выпадку са знішчэннем сярэднявечных могілак у в. Кульшыно.

### ГЛЫБОКАЕ. ПРЭЗЕНТАЦЫЯ КНІГІ

У рамках кампаніі «Будзьма» адбылася першая прэзентацыя новай кнігі з серыі «Кнігарня «Наша Ніва» — «Рэспубліка супраць аўтакратыі. Рэч Паспалітая і Расія ў 1686–1697 гадах». Кніга гісторыка Анджэя Сулімы-Камінскага апавядае пра перыяд зацішша, калі нічога не мянялася на ўсходзе Еўропы. Але тое было зацішша перад бурай, калі адны бяздарна гублялі шанцы, а другія паслядоўна рыхтавалі змену ў балансе сілаў. Прафесар Джорджтаўнскага універсітэта Суліма-Камінскі — адзін з самых аўтарытэтных спецыялістаў па гісторыі Рэчы Паспалітай. Ягоная кніга бліскуча тлумачыць механізм функцыянавання дзяржавы палякаў, беларусаў, украінцаў, літоўцаў — сакрэт яе стойкасці, дзякуючы якому яна стагоддзямі вытрымлівала ціск мацнейшых суседзяў. Удзельнікі імпрэзы таксама азнаёміліся з новай кнігай Алега Латышонка «Нацыянальнасць — беларус».

### ЗАЛЕССЕ. КІРМАШ ЗАПРАШАЕ

8 жніўня ў маёнтку Агінскіх (вёска Залессе Смаргонскага раёна) адбыўся фестываль-кірмаш «Залессе запрашае сяброў». У праграме — выстава-продаж вырабаў народных майстроў, пленэр мастакоў, экскурсія па маёнтку, канцэрт мастацкай самадзейнасці былых і цяперашніх жыхароў Залесся і навакольных вёсак. Тут можна было пакаштаваць традыцыйныя мясцовыя стравы і напоі, навучыцца іх гатаваць. Арганізатары правялі імпрэзу «Запрашаем на паланез!», дзе навучалі ўсіх жадаючых першым крокам гэтага вядомага ў даўніну танца. Шмат хто меў жаданне «сфатаграфавацца з уладаром маёнтка Агінскім», заказаць свой партрэт у мясцовага мастака, а таксама набыць сувеніры з візітоўкай Залесся, дары Залесскай зямлі — бульбу і гародніну, грыбы і ягады, мёд, малако і мясцовыя сыры, яйкі і масла. Шмат хто з мясцовых жыхароў прыняў удзел у свяце, прывёз на продаж свае вырабы.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

ЗВАРОТ

## НЕ СПЫНЯЦЬ ВЯШЧАННЕ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Беларускі маладзёжны рух Амерыкі (БМРА) звярнуўся да кіраўніцтва «Радыё Швецыя» з просьбай не спыняць з 1 верасня вяшчанне на беларускай мове.**

Пра спыненне беларускамоўнага вяшчання паведаміў кіраўнік Міжнароднага канала Шведскага нацыянальнага радыё (у гэты канал уваходзіць «Радыё Швецыя») Інгемар Лёфгрэн. Паводле яго слоў, Шведскае радыё «зрабіла выбар на карысць вяшчання на адной з вялікіх еўрапейскіх моў, а менавіта рускай, тым больш што гэтую мову разумеюць і ў Беларусі». Ён заўважыў, што Міжнародны канал Шведскага нацыянальнага радыё «будзе каналам навін, арыентаваным на слухачоў у Швецыі».

«Праграмы «Радыё Швецыя» на беларускай мове — значна больш, чым проста навіны. Семдзесят працэнтаў насельніцтва Беларусі ніколі не былі за мяжой і таму не маглі бачыць, як функцыянуе дэмакратычнае грамадства. Беларускія праграмы даюць магчымасць беларусам даведацца пра жыццё ў Еўропе, якое будуецца на дэмакратычных законах, — гэта тое, чаго не хапае жыхарам ізаляванай краіны», — гаворыцца ў адозве БМРА.

У сувязі з гэтым БМРА просіць перагледзець рашэнне пра спыненне вяшчання на беларускай мове, якое «грунтуецца на няведанні сапраўднай сітуацыі».

Раней аналагічную адозву кіраўніцтву «Радыё Швецыя» накіравала міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». У падтрымку беларускамоўнага вяшчання таксама выступілі дэпутаты парламента Швецыі — як прадстаўнікі партый урадавай кааліцыі, так і апазіцыі.

**Паводле БелаПАН**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЕЎРАПЕЙСКІ ФОРУМ ПРЫЗНАЧАНЫ НА ЛІСТАПАД

**12 жніўня адбыўся чарговы сход аргкамітэту Беларускага еўрапейскага форуму пад кіраўніцтвам намесніка Руху «За Свабоду» Юрася Губарэвіча. Галоўным вынікам пасяджэння стала прызначэнне даты правядзення форума — 14 лістапада 2009 года.**

Да пачатку лістапада ў Беларусі мусяць прайсці рэгіянальныя сходы, на якіх будуць вылучаныя дэлегаты на Беларускі еўрапейскі форум. Цяпер пададзена 86 заявак на правядзенне сходаў па ўсёй краіне. Першыя рэгіянальныя сходы ўжо адбыліся ў Смалявічах і Клецку. Ад гэтых рэгіёнаў дэлегатамі былі абраныя сем чалавек.

Аргкамітэт Беларускага еўрапейскага форуму зацвердзіў квоту прадстаўніцтва дэлегатаў, узор сімволікі і дакументаў форума. Цягам бліжэйшага тыдня распачне працу сайт форума — на ім можна будзе не толькі знайсці інфармацыю пра само мерапрыемства, але і зарэгістравацць сябе як удзельніка рэгіянальнага сходу па вылучэнні дэлегатаў. Арганізатары разлічваюць, што агулам у форуме возьмуць удзел каля тысячы чалавек.

Бліжэйшым часам на Беларускі еўрапейскі форум таксама будуць запрошаныя замежныя госці: дэпутаты Еўрапейскага парламенту, прадстаўнікі іншых структураў Еўразвязу і дыпламатычнага корпусу краінаў ЕС і краінаў-удзельніц «Усходняга партнёрства», палітыкі, якія прадстаўляюць нацыянальныя парламенты. Нагадаем, што адно з першых запрашэнняў было перададзенае Старшыні Еўрапейскага парламента Ежы Бузэку.

Беларускі еўрапейскі форум мае на мэце мабілізаваць прыхільнікаў і аб'яднаць патэнцыял беларускіх праеўрапейскіх сілаў, а таксама падтрымаць паўнавартасны ўдзел Беларусі ў праграмах еўрапейскага супрацоўніцтва і інтэграцыі.

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду» info@milinkevich.org**

---

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

### ВАЛОЖЫН. ЧАРГОВЫ ПРЫЕЗД АНГЛІЙСКІХ ВАЛАНЦЁРАЎ

Нядаўна ў Валожыне адбылося адкрыццё парніковай гаспадаркі і «Сада Надзеі», узведзеных згодна з праектам вядомага англійскага ландшафтнага дызайнера Саймана Дагала. Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі створаны выдатныя ўмовы для адпачынку, фізічных практыкаванняў і працоўнай тэрапіі. Усе работы вяліся англійскімі валанцёрамі. Сёлетні візіт англічан на Беларусь дванаццаты. Кіраўнік праекта сэр Сайман Дагал кажа, што ён і яго аднадумцы ахоплены жаданнем рабіць добрыя справы, несці людзям радасць. Для гэтага яны на працягу года збіраюць грошы, затым спецыяльна прымяркоўваюць адпачынак. Толькі на набыццё саджанцаў англійскія сябры заплацілі 1000 еўра. Дапамогу валанцёрам аказвалі і мясцовыя арганізацыі.

### ГЛЫБОКАЕ. ВЫБАР ПОМНІКА ПРАЗ СЕЦІВА

Грамадскія актывісты горада распачалі праз інтэрнэт апытанне жыхароў горада і раёна наконт таго, каму б яны хацелі ўстанавіць помнік у сваім краі. Для абмеркавання прадстаўлены чатыры варыянты: Паўлу Сухому, Вацлаву Ластоўскаму, Тадэвушу Даленга-Мастовічу, Іосіфу Корсаку.

### ВАЎКАВЫСК. УШАНАВАЛІ АХВЯРАЎ

Дэмакраты Гродзеншчыны пры падтрымцы актывістаў абласнога аддзялення фонду Льва Сапегі ў трэці раз сабраліся ля крыжа на ўездзе ў горад, які быў пастаўлены ў Памяць усім ахвярам таталітарных рэжымаў. Паколькі як бальшавікі, так і гітлераўцы вязняў мясцовай турмы расстрэльвалі ў розных мясцінах горада, было вырашана ўстанавіць крыж на месцы аднаго з былых уніяцкіх храмаў. Набажэнства па бязвінна забітых адслужыў уніяцкі святар. Затым перад усімі, хто сабраўся, а іх было болей за паўсотні, з канцэртам выступіў бард Зміцер Бартосік.

### ЛЕЛЬЧЫЦЫ. ЗОНЫ АДПАЧЫНКУ

Мясцовыя актывісты грамадскай кампаніі «Наш дом», якім кіруе Мікалай Гаўрыленка, сабралі сярод жыхароў мястэчка подпісы пад зваротам аб добраўпарадкаванні возера Мох. Возера знаходзіцца амаль у цэнтры населенага пункта, але мае непрывабны выгляд і вельмі забруджана. Ідэя акцыі — супольна з уладамі ачысціць вадаём і стварыць там зону адпачынку. Заява з подпісамі і прапановай накіравана дэпутатам райсавета і старшыні райвыканкама.

### ЛІДА. ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ НА КРЫЖАХ

«На крыжах» — так называецца месца, дзе амаль дзесяць гадоў таму грамадскія актывісты, прыхільнікі беларускасці непадалёку ад горада ля пасёлка Далёкія адшукалі пахаванне паўстанцаў 1863 года. Колькасць пахаваных невядома, але старэйшыя людзі сцвярджаюць, што надмагільных камянёў было болей за сотню. У свой час тут былі ўсталяваны праваслаўны і каталіцкі крыжы. Збірацца напачатку жніўня тут штогод для лідзян стала традыцыяй. І Лідскі райвыканкам дае афіцыйны дазвол на правядзенне гэтага мерапрыемства.

### БРЭСТ. АДС СУПРАЦЬ КАМУНАЛЬШЧЫКАЎ

Абласная кааліцыя АДС распачала рэалізацыю кампаніі «За наш горад». Яна будзе доўжыцца на працягу года. Папярэдне стратэгія і тактыка супольных дзеянняў была абмеркавана ў раёнах. У кампаніі дзве мэты: інфармаванне грамадзян аб іх камунальных правах і садзейнічанне людзям у іх абароне.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# УСЁ ЛЕПШАЕ — СКАЦІНЕ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**У Савецкім Саюзе быў знакаміты лозунг: «Усё лепшае — дзецям!». Зыходзячы з вандроўкі Аляксандра Лукашэнкі па раёнах і мястэчках Беларусі з мэтаю праверыць, як ідзе ўборачная кампанія і як развіваецца сельская гаспадарка, можна перайначыць гэты лозунг: «Усё лепшае — скаціне!».**



Photo.ByMedia.Net

Пасля наведвання свінаводчага комплексу прадпрыемства «Белдан» Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі ёсць добрая магчымасць пераняць лепшыя перадавыя еўрапейскія тэхналогіі і ўкараніць іх у сябе. Паводле слоў прэзідэнта, у яго «складліся самыя добрыя ўражанні» ад убачанага, а такія комплексы неабходна паступова ўкараняць па ўсёй краіне. «Вось узор. Нам трэба вызначыцца, колькі комплексаў неабходна ў рэгіёнах, і паступова рэканструяваць старыя і ствараць падобныя сучасныя комплексы. Нічога прыдумваць не трэба, мы ўжо бярэм гатовыя тэхналогіі. Сёння іх трэба «выцягваць» з Еўропы», — сказаў Лукашэнка.

«Хай хоць свінні зажывуць паеўрапейску!», — кпілі з прэзідэнта некаторыя аналітыкі. А што тут кпіць? Не трэба забываць, што свіння, — найбольш блізкая па генетычнаму коду да чалавека жывёла. Дык чаму б не правесці эксперымент па «еўрапейскасці» спачатку на свіннях, а ўжо потым — на людзях? Бо папрызвычайваліся адразу на людзях, без эксперыментаў. А раптам генетычны код беларускай свінні наўпрост адкіне «еўрапейскі вектар»? Тады яшчэ ўсе будуць удзячныя за тое, што ў людзей не з'явілася алергічнай рэакцыі на «еўрапейскую прышчэпку», і нашы шпіталі не былі перапоўненыя хворымі на «еўрапейскую чумку».

Таксама Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў свінагадоўлі Беларусі «пачынаецца рэвалюцыя». Ай, лепш не трэба!

Так і бачу намётавы гарадок на плошчы Незалежнасці ў Мінску, дзе п'яныя свінні з маўзерамі бяруць штурмам будынак урада, а прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі збягае ад іх у жаночым адзенні. Прычым, «свінням-камісарам» нават «скуранак» не трэба — яны ў іх натуральныя. Дарэчы, варта ўзгадаць, што ў XVIII стагоддзі менавіта Беларусь забяспечвала ўсю Еўропу «скуранкамі», а не Турцыя, як зараз.

Ідэя не новая. Рэвалюцыя жывёл і ўсё, што з гэтага вынікае, выдатна апісаны ў антыўтопіі Джорджа Оруэла «Ферма». Памятаеце: «Усе жывёлы роўныя, але некаторыя раўнейшыя»? Так што лепш засцерагацца ад такой «рэвалюцыйнасці».

А калі больш сур'ёзна, то куды мы гэтых хрушак падзенем? Экспарт у Расію? Пасля «мяса-малочнай вайны» гэты тэзіс выглядае вельмі сумнеўным. Расія заўсёды знойдзе, да чаго дачапіцца, як гэта было не толькі з нашым мясам і малаком, але і з латвійскімі шпротамі, малдаўскім і грузінскім вінам, і нават з мінералкай «Баржомі». Экспарт у Еўропу? Там свайго мяса хапае. Больш за тое, пры заробках у два ці два з паловай разы большых, чым у нас, мяса там каштуе ў два ці два з паловай разы ніжэй. Украіна? З іх любоўю да сала там свінагадоўля развітая ўжо ніяк не горш, чым у нас.

Застаецца ўнутраны рынак. Але, калі мы будзем вырабляць «еўрапейскае» мяса, то і кошты на яго павінны быць еўрапейскія. Па суадносінах «заробак — кошт» (глядзіце вышэй) кошт на свініну, пры існых заробках, у нас павінен быць зніжаны як мінімум у чатыры разы. Хто на гэта пойдзе?

Ну дый годзе пра свіней. Пытанне, калі ў Беларусі па-еўрапейску зажывуць людзі? Статыстычнае агенцтва Еўрастат апублікавала ўзроўні заробкаў па краінах Еўрасаюза. Найвышэйшы мінімальны заробак у ЕС у Люксембургзе — 1 тысяча 642 еўра. У Ірландыі — 1 тысяча 462 еўра, Бельгіі — 1 тысяча 387. Самы нізкі ўзровень мінімальнага заробку ў ЕС у пераліку на еўра ў Балгарыі (123) і Румыніі (153).

Нагадаем, што 1 студзеня ўрад Беларусі ўстанавіў памер мінімальнай заработнай платы ў 229700 рублёў. Гэта каля 57 еўра. Амаль у тры разы менш, чым у бяднейшай краіне Еўрасаюза.

Са свабодай асацыяцый таксама не ўсё нармальна. На тыдні Вярхоўны суд у чарговы — ужо трэці — раз адмовіў у рэгістрацыі праваабарончай арганізацыі «Наша Вясна», правапераемніцы ліквідаванага ў 2003 годзе грамадскага аб'яднання «Вясна». Гэта нягледзячы на тое, што 24 чэрвеня 2007 года Камітэт па правах чалавека ААН прызнаў: калі беларускія ўлады ліквідавалі «Вясну», яны парушылі пункт 1 артыкула 22 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. ААН заклікаў аднавіць рэгістрацыю «Вясны», але ў Мінску гэта рашэнне праігнаравалі. Не дапамагло нават тое, што 6 сакавіка 2004 года цэнтр «Вясна» быў прыняты ў Міжнародную федэрацыю правоў чалавека.

«Беларускія ўлады не жадаюць рэгістраваць яе па незаконных, на мой погляд, прычынах. Мы расцэньваем гэта як сістэматычную дыскрымінацыю праваабаронцаў і будзем падаваць іск у Камітэт па правах чалавека ААН. Я выдатна ўсведамляю тое, што ў выніку гэтай заявы я трапляю пад дзеянне артыкула 193–1 Крымінальнага кодэкса (дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі). Але я заяўляю, што з рэгістрацыяй або без яе беларускія праваабаронцы не спыняць сваю дзейнасць», — сказаў адзін з заснавальнікаў «Нашай Вясны», праваабаронца Валянцін Стэфановіч.

Ёсць, дарэчы, і пазітыўныя навіны: 8 жніўня адзін з трох арыштаваных ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Юрый Лявонаў адпушчаны на волю. Яму зменена мера ўтрымання са знаходжання пад вартай на падпіску аб нявыездзе. Але, тым не менш, таварышы Лявонава Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка, з якімі ён быў затрыманы 8 лютага, працягваюць заставацца ў мінскім СІЗА № 1. 18 лютага ўсім тром было прад'яўлена абвінавачанне па артыкуле 218 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці). Гэта абвінавачванне з Лявонава не знятае, але ён вызвалены з СІЗА, а астатнія — не. І дзе тут логіка?

І нельга не адзначыць тое, што прэзідэнт Беларусі праводзіць суверэнную знешнюю палітыку. Прынамсі, так ён сам заявіў. «Беларусь будзе падпісваць дакументы ў рамках АДКБ, калі яны выгадныя для краіны», — сказаў Лукашэнка ў ходзе наведвання Мінскай вобласці 11 жніўня. «Калі мы збіраемся гінуць адзін за аднаго, то, хлопцы, давайце не будзем накатваць адзін на аднаго. Давайце не будзем наязджаць. Давайце будзем жыць, як у адной дзяржаве, як гэта ў Еўрасаюзе. І зразумелая тады сама структура NATO, што яны ваююць адзін за аднаго. Там жа няма ні бар'ераў, ні межаў. Гэта выключана. Там моцныя дапамагаюць слабым. А ў нас усё наадварот у гэтай сітуацыі», — сказаў Лукашэнка.

Што ж, калі Аляксандр Рыгоравіч і ў гэтым кантэксце заявіў пра Еўрасаюз, можа, і людзям чаго абломіцца?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### МІКАЛАЙ ЧАРНАВУС

Баранавіцкі прадпрымальнік Мікалай Чарнавус у часы крызісу зладзіў на рынку дабрачынны абед. Гэта ўжо другая грамадская акцыя бізнесоўца за гэта лета. Прадпрымальнік, які гандлюе на рынку дзіцячымі цацкамі, сам падрыхтаваў абед: боршч, кашу з мясам і кампот. Дабрачыннымі абедамі Мікалай Чарнавус хоча падтрымаць малазабяспечаныя сем'і, бяздомных грамадзянаў. Іншыя прадпрымальнікі Баранавічаў да падобнай дабрачыннасці пакуль не далучыліся. Варта адзначыць, што добрыя намеры Чарнавуса не ацаніла мясцовая санстанцыя. На другі дзень пасля акцыі Мікалая выклікалі ў гарадское ўпраўленне «Баранавіцкі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі», дзе паведамілі, што раздаваць ежу на рынку — негігіенічна. Цікава, ці згодныя з санстанцыяй тыя, для каго рыхтуюцца бясплатныя абеды? Мікалай Чарнавус мае намер працягваць арганізацыю бясплатных абедаў, але, каб пазбегнуць прэтэнзій санстанцыі, будзе арэндаваць сталовыя горада. Праўда, грошы, якія пайшлі б непасрэдна на абед, цяпер трэба будзе сплаціць за арэнду памяшкання.



### МІХАСЬ ІЛЫН

Улады пачынаюць ціск на чарговага актывіста арганізацыі «Малады Фронт». Кіраўніка Брэсцкай філіі «Маладога фронту» Міхася Ільіна завезлі ў пракуратуру, дзе папярэдзілі, што супраць яго будзе распачата крымінальная справа, калі хлопец не спыніць удзел у маладзевай арганізацыі. Напярэдадні мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Крымінальны кодэкс Беларусі быў унесены 193-ці артыкул, які прадугледжвае крымінальны пераслед за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. За гэты час па ім былі асуджаныя чатырнаццаць чалавек, пяцёра іх адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі.

### МІХАІЛ КОМАР



Былы генеральны дырэктар ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат» асуджаны Гомельскім абласным судом да дзевяці гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць кіруючыя пасады тэрмінам на пяць гадоў. Былы кіраўнік буйнейшага беларускага прадпрыемства па перапрацоўцы малака «прызнаны вінаватым у крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі пры завалоданні маёмасцю, учыненым службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў арганізаванай групай, у буйным памеры» (ч. 4 арт. 210 Крымінальнага кодэкса), — перадае БелаПАН. Комара таксама прызналі вінаватым у незаконным набыцці і захоўванні боепрыпасаў (ч. 2 арт. 295 Крымінальнага кодэкса), за што абвінавачанаму прызначаны адзін год пазбаўлення волі без канфіскацыі. Адбываць пакаранне Міхаіл Комар будзе ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму, акрамя таго, суд пастанавіў спагнаць з экс-дырэктара на карысць Рагачоўскага малочна-кансервавага камбіната больш за 8,7 мільярда рублёў.

Разам з Міхаілам Комарам у крымінальнай справе фігуруе яго сын, які таксама меў дачыненне да фінансавых махінацый. Грошы раскрадаліся шляхам заключэння фіктыўных дамоваў. Сына Міхаіла Комара, якому 29 гадоў, пасля абвяшчэння ў міжнародны вышук, затрымалі ў Іспаніі. Яго таксама чакае суд.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# А ІДЗІЦЕ ВЫ Ў ЛАЗНЮ!

Сяргей НІКАЛЮК

**У якасці эпіграфа прывяду словы дырэктара «Левада-цэнтра» Льва Гудкова: «Самы цікавы вынік сацыяльна-эканамічнай гісторыі апошніх 15 гадоў — узнікненне спосабаў выжывання насельніцтва ў новых умовах, і гэтыя спосабы надзвычай слаба даследаваныя».**





Калі хтосьці адкрытым тэкстам пасылае вас у лазню, то, хутчэй за ўсё, не з мэтай папарыцца. Проста гэты хтосьці — чалавек, па сучасных мерках, выхаваны, і вам пашанцавала, таму што часцей у нас пасылаюць у больш традыцыйныя месцы. Аднак калі з узроўню эмацыйных міжасобасных камунікацый перайсці на ўзровень, дзе вырашаюцца рэальныя пытанні, то лепшага месца, чым лазня, для гэтага не знайсці.

## «Наша ўсё»

Зразумела, гаворка вядзецца не пра якую-заўгодна лазню. Мы маем на ўвазе лазню, у якой збіраюцца «патрэбныя людзі». Быць пасланым у такую лазню — запаветная мара шматлікіх беларусаў. Аўтаматычна туды не пасылаюць. Вось і даводзіцца здзяйсняць цуды вынаходлівасці. Узгадваць імёны аднакласнікаў, аднакурснікаў, аднапалчан. Словам, тузаць за нітачкі сацыяльных сувязяў, якія ўсе мы прадзем па ходу жыцця.

Лазня з «патрэбнымі людзьмі» — гэта прыватны выпадак нашага найважнейшага сацыяльнага здабытку, якім з'яўляецца інстытут асабістых сувязяў (блату). Гэта «наша ўсё». Наша, калі хочаце, грамадзянская супольнасць, якую ўжо столькі гадоў беспаспяхова шукаюць незалежныя аналітыкі.

Дадзім слова Сымону Кардонскаму, мабыць, самому арыгінальнаму расійскаму мысляру: «Існуюць шырока распаўсюджаныя і ўстойлівыя інстытуты грамадзянскай супольнасці: хатняе або рэстараннае застолле, лазня з дзяўчаткамі і без іх, паляванне і рыбалка, самадзейныя клубы (такія, як гульня ў футбол па суботах у чыноўнікаў мэрыі Масквы), сумесны адпачынак, дачныя супольнасці. У апошнія дзесяцігоддзе вельмі значным інстытутам грамадзянскай супольнасці сталі канфесійныя адносіны… Калі людзі здзяйсняюць рэлігійныя абрады, выпіваюць, забаўляюцца, пастрэльваюць па птушачках, парацца і плёткараць пра тое, хто, колькі і за што бярэ, яны шукаюць і, як правіла, знаходзяць, «выхады» на чыноўнікаў, якія дапамогуць ім мінімізаваць падаткі, выйграць тэндэр, атрымаць зямлю пад забудову, уладкаваць сваяка ў «элітную» клініку, вызваліць сына ад прызыву ў войска, прыладзіць дачку ў прыстойную ВНУ, вярнуць забраныя ДАІ дакументы на машыну, закрыць крымінальную справу на партнёра або арганізаваць наезд сілавікоў на канкурэнта».

Пагадзіцеся, знаёмая карціна. Але, у адрозненне ад Кардонскага, большасць з нас наўрад ці спрабавала асэнсаваць яе ў катэгорыях «сацыяльны інстытут» і «грамадзянская супольнасць». Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Калі закусваем гарэлачку салёным агурочкам і вясковым салам, мы ж не ўзгадваем пры гэтым пра тлушчы, бялкі і вугляводы, а тым больш пра таямнічыя ферменты, без непасрэднага ўдзелу якіх немагчыма расшчапленне ні першага, ні другога, ні трэцяга кампанента ежы.

## Пра дзяржаўнае і асабістае

Мне запярэчаць, што рашэнне разглядаць лазню ў якасці інстытута грамадзянскай супольнасці з'яўляецца спрэчным. Згодны. Класічная (заходняя) грамадзянская супольнасць характарызуецца трыма асноўнымі прыкметамі.

Па-першае, шматстайнасцю яго складнікаў. Калі да лазні далучыць сумесныя застоллі, стральбу па птушачках і ды г. д., то з першай прыкметай у нас усё добра.

Па-другое, грамадзянская супольнасць характарызуецца аўтаноміяй сваіх арганізацый. І з гэтым праблем няма. Усе пералічаныя вышэй структуры нашай грамадзянскай супольнасці паўсталі не дзякуючы, а насуперак дзяржаве. Яны існуюць паўсюдна, дзе ёсць людзі. Пры спробе дзяржавы іх «пастроіць», яны самаліквідуюцца, але толькі для таго, каб адразу ж паўстаць на новым месцы.

Па-трэцяе, грамадзянская супольнасць характарызуецца наяўнасцю грамадзянскай свядомасцю. А вось з гэтым у нас відавочны пракол. Не палічыце за таўталогію, але сапраўдная грамадзянская супольнасць можа складацца толькі з грамадзян. Звернемся да нямецкага палітолага Людвіга Дарэндорфа: «Грамадзянін не пытае, што іншыя, асабліва дзяржава, могуць зрабіць для яго, а сам робіць нешта. Грамадзянскі гонар, грамадзянская мужнасць — ёсць шмат усякіх словазлучэнняў для характарыстыкі дабрадзейнасцяў чальцоў грамадзянскіх супольнасцяў».

Што ж прымушае суайчыннікаў збірацца ў лазнях? Якімі грамадзянскімі дабрадзейнасцямі яны пры гэтым кіруюцца? Адказы на гэтыя пытанні не з'яўляюцца таямніцай. Калі максімальна коратка, то ў лазнях адбываецца «распілоўванне» дзяржаўных рэсурсаў на карысць пэўных грамадзян (слова «грамадзянін» ужываецца ў дадзеным выпадку ў побытавым сэнсе, і Дарэндорф тут не пры чым).

Схема максімальна простая. У папярэдніх «Азбуках паліталогіі» я неаднаразова звяртаў увагу на тое, што сутнасць як палітычнага, так і эканамічнага жыцця роднай дзяржавы заключаецца ў максімальнай канцэнтрацыі рэсурсаў для наступнага іх засваення. Калі даць дзяржаве волю, то яна падграбе пад сябе ўсё. Але на шляху паталагічнай дзяржаўнай прагнасці і паўстае наша грамадзянская супольнасць. Яна інстытуцыялізаваная, але не арганізаваная. Яна бясформенная, але цэнтралізаваная дзяржава з усімі сваімі «вертыкалямі» перамагчы яе не ў стане.

Людзі старэйшага пакалення, спадзяюся, яшчэ не забылі мініяцюру Аркадзя Райкіна пра дэфіцыт, асноўная маса якога ў савецкі час размяркоўвалася не па афіцыйных каналах, а праз сістэму асабістых сувязяў («таваравед, заўсклад»). Звярніце ўвагу, галоўную ролю ў перараз-меркаванні (чытай, раскраданні) дзяржаўных рэсурсаў адыгрывалі тыя, хто паводле службовых абавязкаў мусіў сачыць за іх захаваннем і правільным размеркаваннем. Карацей, хто што ахоўваў, той тое і меў.

## Свабода на шасці сотках

Наколькі складана/лёгка аб'ядноўваюцца беларусы для сумеснай дзейнасці? Адназначна на гэта пытанне адказаць немагчыма. Усё залежыць ад таго, у рамках якой грамадзянскай супольнасці плануецца гэту дзейнасць разгарнуць. Калі заходняй, то ўсё залежыць ад аб'ёму фінансавання з боку замежных фундатараў. Але ў любым выпадку адсутнасць такога фінансавання азначае, што грамадзянская актыўнасць абмяжуецца сумеснай працай над афармленнем заяўкі для атрымання гранта. Дарэчы сказаць, у «грамадзянскіх» ініцыятыў, якія падтрымлівае ўлада (БРСМ, «Белая Русь» і г.д.) такі ж самы лёс. Ёсць дзяржаўнае фінансаванне — ёсць дзейнасць. І сэнс яе, як гэта няцяжка здагадацца, складаецца ў засваенні вылучаных рэсурсаў.

Што да нашай грамадзянскай супольнасці, то ў знешнім фінансаванні яна не мае патрэбы. Возьмем, для прыкладу, любы дачны кааператыў. Хто прабіваў у свой час рашэнне пра вылучэнне ўчастку, на чые грошы пракладвалася дарога, падводзілася электрычнасць, вада, будавалася агароджа па вонкавым перыметры? Усяго не пералічыць. У што гэта абышлося ў маштабах рэспублікі? Зразумела, што лік пойдзе мільярды долараў!

Але дзеля чаго былі выдаткаваныя грошы, праца і нервы, ды яшчэ ў такіх цыклапічных колькасцях? Выдаткаваныя, звярніце ўвагу, без цэнтралізаванага планавання, без кантролю з боку КДК, КДБ, Адміністрацыі прэзідэнта, нарэшце! Для таго, каб, апынуўшыся бліжэй да роднай прыроды, фармаваць у сабе грамадзянскія дабрадзейнасці? Не, усё прасцей і адначасова складаней. Дача — гэта месца для ўнутранай эміграцыі. Менавіта тут нашы грамадзяне хаваюцца ад дзяржавы, ад яе ўсёбачнага вока. Тут яны самарэалізуюцца падчас засваення матэрыяльных рэсурсаў, якія здолелі вырваць у роднай дзяржавы падчас лазневых вячорак і стральбы па птушачках з «патрэбнымі людзьмі».

Аўтарытарныя рэжымы, у адрозненне ад рэжымаў таталітарных, не прэтэндуюць на кантроль асабістага жыцця падданых, таму падданыя і арганізуюць сваю асабістую прастору свабоды на шасці сотках. Лозунг «За Свабоду!» для іх актуальны. Яны, калі спатрэбіцца, гатовыя за свабоду глотку перагрызці, але ў межах вышэйзгаданых сотак.

## Міфы оптам і ў розніцу

Перш чым падвесці рысу, рэкамендую чытачам вярнуцца да выказвання Льва Гудкова. Усе мы (ва ўсялякім разе тыя, хто прэтэндуе на званне аналітыкаў і палітыкаў) маем вельмі цьмянае ўяўленне пра беларускае грамадства, а таму ўвесь час міфалагізуем сацыяльную рэчаіснасць. У гэтай рэчаіснасці ўсё проста і зразумела. Беларусы, да прыкладу, дзеляцца на тых, хто не ведае Праўду, і на тых, хто яе ведае. Першыя падтрымліваюць уладу, другія — не. Так паўстае «пераможная стратэгія», якая тыражуецца ад выбараў да выбараў і сутнасць якой зводзіцца ў «данясенні Праўды да электарату».

Паводле іншага папулярнага міфа, існуе зваротная залежнасць паміж узроўнем жыцця насельніцтва і попытам на дэмакратычную альтэрнатыву, і гэта нягледзячы на тое, што ў айчыннай гісторыі такая залежнасць ні разу не назіралася. Звернемся да табліцы. Чым адрозніваюцца жыццёвыя стратэгіі беларусаў ва ўмовах сістэмнага крызісу пачатку 90-х ад стратэгій ва ўмовах стабільнасці? Адказ відавочны. Крызіс стымулюе пошук асабістых сувязяў (72,4%) і абыходных шляхоў (56,3%). Як першае, так і другое па сваёй прыродзе антысацыяльнае, яно чужое сумеснай публічнай дзейнасці.

Прычыны і характар палітычнай актыўнасці нашай грамадзянскай супольнасці ў пачатку 90-х да гэтага часу не ўсвядомлены беларускімі аналітыкамі. Грамадзянскую супольнасць яны папросту не заўважаюць, а шмат хто і не падазрае пра яе існаванне. Адсюль яшчэ адзін міф — міф пра «выпадковага прэзідэнта», які выдатна спалучаецца з міфам пра «руку Масквы». Гэтым, на жаль, спіс міфаў не абмяжоўваецца.

**ДЫНАМІКА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ: «ШТО ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ, ПАВОДЛЕ ВАШАГА МЕРКАВАННЯ, ВЯДЗЕ ДА БАГАЦЦЯ?», % (МАГЧЫМЫ БОЛЬШ ЗА АДЗІН АДКАЗ)**

| Варыянт адказу | 12'93 | 01'07 | 03'08 | 03'09 |
|---|---|---|---|---|
| Асабістыя сувязі | 72,4 | 42,9 | 47,1 | 45,7 |
| Несумленнасць | 56,3 | 15,5 | 24,7 | 22,4 |
| Праца | 36,6 | 68,2 | 59,0 | 63,4 |
| Талент | 32,2 | 34,9 | 25,2 | 24,0 |
| Шанцаванне | 29,6 | 39,1 | 34,1 | 39,6 |
| Адукацыя | 22,2 | 37,6 | 31,8 | 32,7 |

Паводле НІСЭПД

СУД

# «НАШАЙ ВЯСНЕ» ЗНОЎ АДМОВІЛІ

Генадзь КЕСНЕР

**12 жніўня Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь чарговы раз падтрымаў рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Праваабарончага грамадскага аб'яднання «Наша вясна».**

Такім чынам, суд не задаволіў скаргу праваабаронцаў Алеся Бяляцкага, Валянціна Стэфановіча і Уладзіміра Лабковіча на дзеянні Мінюста. Незалежныя назіральнікі назвалі такое рашэнне суда, і ўвогуле дзеянні Мінюста, «ганьбаю беларускага правасуддзя».

Судовыя пасяджэнні доўжыліся тры дні. Іх, дарэчы, па-беларуску вёў суддзя Вярхоўнага суда Анатоль Церах. Інтарэсы Міністэрства юстыцыі прадстаўляў Аляксандр Харытон, добра вядомы сваім спрычыненнем да забароны шэрагу палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, а таксама да адмоваў у рэгістрацыю шматлікіх няўрадавых арганізацый і палітычных партый.

Як адзначыў сябра рады «Нашай вясны» Уладзімір Лабковіч, за аснову свайго рашэння ў падтрымку высноваў Мінюста суд паклаў дзве падставы: па-першае, на трох асобаў з сямідзесяці дзвюх, якія былі ў спісах заснавальнікаў грамадскага аб'яднання, былі пададзены быццам бы несапраўдныя персанальныя дадзеныя. Прычым у адным выпадку за грубую памылку і міністэрства, і суд палічылі наступны факт: адзін з заснавальнікаў з'яўляўся кіраўніком спартыўнага гуртка дому культуры, а ў дакументах яго назвалі кіраўніком спартыўнай секцыі. Астатнія памылкі былі падобнага кшталту. Па-другое, праваабаронцы не далі праз тэлефонны званок магчымасці чыноўнікам праверыць тэхнічную адпаведнасць юрыдычнага адрасу «Нашай вясны», бо тыя, хто тэлефанаваў, як паведаміў Уладзімір Лабковіч, не прадставіліся. У выніку гарантыйны ліст аб прадастаўленні грамадскаму аб'яднанню юрыдычнага адрасу быў прызнаны нікчэмным.

Варта, аднак, адзначыць, што суддзя адхіліў такія довады міністэрскага чыноўніка: маўляў, нельга рэгістраваць аб'яднанне, заснавальнікі якога быццам бы атрымліваюць грошы ад заакіянскіх спонсараў і робяць перад імі справаздачы, што яны часта ездзяць у замежныя камандзіроўкі, што некаторыя былі прыцягнуты да адміністратыўнай адказнасці і гэтак далей.



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Валянцін Стэфановіч і Алесь Бяляцкі (у цэнтры)

«Пытанне рэгістрацыі «Нашай вясны» неаднаразова ўздымалася ў рэзалюцыях Еўрапейскага парламента, Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы, у пастановах Еўрапейскай камісіі, — нагадвае Уладзімір Лабковіч. — Тое, што адбываецца зараз, сведчыць пра адсутнасць у краіне сістэмных зменаў, пра тое, што перамены маюць дэкаратыўны характар, што ў Беларусі груба парушаецца права грамадзян на асацыяцыю».

За ходам разгляду скаргі наглядаў упаўнаважаны місіі МФПЧ — Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека (Парыж) Кірыл Каратаеў, які з'яўляўся назіральнікам гэтага працэсу паводле мандату Абсерваторыі па абароне правоў праваабаронцаў — сумеснай праграмы МФПЧ і Сусветнай арганізацыі супраць катаванняў.

«Гэта чарговая ганьба беларускай юстыцыі, — назваў цяперашняе судовае рашэнне па скарзе «Нашай вясны» і ранейшыя рашэнні Міністэрства юстыцыі па нерэгістрацыі гэтага праваабарончага грамадскага аб'яднання Кірыл Каратаеў. — Сапраўды, бакі мелі магчымасць прадставіць свае аргументы суду, але ў гэтым не было неабходнасці. Па-першае, рашэнне суда было цалкам прадвызначана заключэннем пракурора, а ўсё астатняе на рашэнне суда не ўплывала. Апроч таго, супраць заяўнікаў скаргі выступілі адразу тры структуры — Міністэрства юстыцыі, пракуратура і Вярхоўны суд, бо незалежнасць суддзяў і аб'ектыўнасць іх рашэнняў выклікаюць сумненне... Можна дапусціць, што ў дакументах утрымліваліся пэўныя недахопы, але мы не пачулі ў судзе адказу на галоўнае пытанне: чаму вялікай колькасці людзей было адмоўлена ў адным з галоўных іх правоў — у праве на асацыяцыю, гарантаваным як Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, так і міжнародным заканадаўствам, у прыватнасці, Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах? Таму што для апраўдання такой адмовы патрэбны не толькі законныя падставы, але неабходна прапарцыйнасць, патрэбны пераканаўчыя аргументы. Гэтая адмова — не прапарцыйная і не падтрымліваецца ніякімі пераканаўчымі аргументамі».

Шчыра кажучы, заснавальнікі ПГА «Наша вясна» і не спадзяваліся на тое, што іх дзейнасць будзе легалізавана. Таму яшчэ раней яны заяўлялі, што будуць працягваць сваю дзейнасць, нягледзячы на пазіцыю ўлад і стаўленне чыноўнікаў да праваабарончага руху ў цэлым.

СПРАВА

# ЮРЫЙ ЛЯВОНАЎ ВЫЗВАЛЕНЫ ПАД ПАДПІСКУ АБ НЯВЫЕЗДЗЕ

## МІКАЛАЙ АЎТУХОВІЧ І УЛАДЗІМІР АСІПЕНКА ЗАСТАЮЦЦА ПАД ВАРТАЙ

Вольга ХВОІН

**Юрый Лявонаў вызвалены пад падпіску аб нявыездзе праз паўгады пасля ўтрымання ў следчым ізалятары Мінска. Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка застаюцца пад вартай. Яны былі затрыманыя па падазрэнню ў падпалах (арт. 218 КК «Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці»).**


Фота gdb.rfet.org

Юрый Лявонаў

Юрыю Лявонаву, у адрозненні ад Аўтуховіча і Асіпенкі, не было прад'яўлена дадатковае абвінавачванне ў тэрарызме. Таму 8 жніўня скончыўся чарговы тэрмін утрымання Лявонава пад вартай. Раней адвакат абвінавачваемага звяртаўся з хадайніцтвам да намесніка генеральнага пракурора пра тое, каб Лявонаву была зменена мера стрымання з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе. Пасля выхаду з СІЗА Юрый Лявонаў стрымана расказаў журналістам, што адчувае сябе добра, і нават стан здароўя палепшыўся, бо скінуў залішнюю вагу.

Каментаваць акалічнасці вядзення справы Юрый адмаўляецца, матывуючы гэта дадзенай падпіскай аб нераскрыцці таямніцы следства, аднак запэўнівае, што следчыя мерапрыемствы за гэтыя паўгады насамрэч вяліся. Юрый Лявонаў сваю віну ў падпале маёмасці ваўкавыскага міліцыянта не прызнае і ўпэўнены, што Аўтуховіч з Асіпенкам да гэтай справы таксама не маюць дачынення.

Следства па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, якіх абвінавачваюць у падпалах, падоўжана да 8 кастрычніка. Мяркуецца, што за наступныя два месяцы яно будзе завершана. Юрый Лявонаў лічыць, што судовы працэс па яго справе пачнецца ў лістападзе гэтага года.

Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка застаюцца пад вартай у следчым ізалятары № 1 горада Мінска, так званай «Валадарцы». У ліпні стала вядома, што галоўнае следчае ўпраўленне папярэдняга расследавання МУС Рэспублікі Беларусь распачало ў дачыненні «да Аўтуховіча М. М. і іншых асоб» крымінальную справу па арт. 359 Крымінальнага кодэкса Беларусі (тэрарыстычны акт). Гаворка вядзецца пра быццам бы выкрытую змову аб замаху на губернатара Гродзенскай вобласці Уладзіміра Саўчанку і намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Каменку. Падазраваным па справе нібыта праходзіць Мікалай Аўтуховіч. Поўная інфармацыя па гэтай справе, зрэшты, як і па справе аб падпалах, утойваецца.

З 16 красавіка па 16 ліпеня Аўтуховіч праводзіў галадоўку пратэсту, патрабуючы аб перадаць справу ў суд, або змяніць усім падследным меру стрымання з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе. Аднак змог толькі прыцягнуць увагу СМІ і міжнароднай супольнасці.

Летам у Беларусь наведаўся эксперт АБСЕ Марцін Фінке. Ён азнаёміўся са правай ваўкавыскіх прадпрымальнікаў і прыйшоў да высновы, што яна расследуецца без працэсуальных парушэнняў, і няма тут падстаў для палітычнага складніка. Аднак поўная справаздача М. Фінке абнародавана не была.

Юрыст Алег Волчак, які пільна сочыць за справаю Аўтуховіча, лічыць, што цяпер усё паказвае на тое, што судовы працэс пройдзе ў закрытым рэжыме. «Як былы следчы скажу, што справа можа быць працягнутая, і не на адзін месяц. Цяпер усё робіцца, каб працэс зрабіць закрытым. Да таго ж, каб навесці вэрхал у Еўропе. Замах на губернатара, тэрарызм — ведаеце, як гэта гучыць...»

«Думаю, што следчыя цягнуць час, бо таксама не бачаць перспектывы ў накіраванні справы ў суд, — гаворыць Алег Волчак. — Аднак выпусціць Асіпенку і Аўтуховіча яны не могуць, бо гульня з "тэрарыстамі" далёка зайшла. Вызваленне Лявонава — гэта вынік ціску не толькі беларускай грамадскасці, але і нашых міжнародных партнёраў, якія таксама актыўна ўплываюць на кіраўніцтва Беларусі, каб яно вызваліла з-пад варты ваўкавыскіх прадпрымальнікаў. Думаю, улады зразумелі, што справу прайгралі, а таму прынялі рашэнне паволі вызваляць гэтых вязняў. Варта адзначыць: усё ж сёй-той ва ўрадзе разумее, што далейшае супрацоўніцтва з Еўропай трэба працягваць без палітвязняў».

Юрыст гаворыць, што хутчэй за ўсё справу будзе разглядаць Вярхоўны суд, бо ўсе арышты абвінавачваемых, падаўжэнні тэрмінаў следства праводзіліся са згоды генеральнага пракурора і яго намеснікаў.

ЭКАЛОГІЯ

# Ігар Пастухоў: «АДНО З ДВУХ — ЦІ АЭС, ЦІ ЗАКАЗНІК»

**Яшчэ на пачатку ліпеня Ігар Пастухоў, дырэктар ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры», што размяшчаецца прыблізна ў пяці кіламетрах ад Астравецкай пляцоўкі, звярнуўся ў Савет міністраў і Міністэрства энергетыкі з заклікам не будаваць АЭС паблізу ад ахоўных прыродных тэрыторый. Праз некалькі тыдняў Ігара Пастухова звольнілі. Ці ёсць сувязь паміж гэтымі падзеямі, і чаму спецыяліст наважыўся выступіць супраць сістэмы, у якой працаваў, высвятляла Вольга Хвоін.**



Фота Аляксандра Наумава

**Заказнік**

«Сарачанскія азёры» размешчаны ў Астравецкім раёне Гродненскай вобласці. Налічвае 14 азёраў: Глухое, Бараньскае, Клеўе, Белае, Залоўскае, Каймінскае, Сарочча, Туравейскае, Тумскае, Галодна, Падкасцялок, Едзі, Губеза, Вераб'і. Працягласць — больш за 20 кіламетраў.

У лістах на адрас Саўміна і Мінэнерга цяпер ужо былы дырэктар ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры» Ігар Пастухоў звярнуў увагу, што ў Беларусі, ужо пацярпелай ад Чарнобыля, засталося не так шмат не закранутых радыеактыўным забруджваннем месцаў. Адно з такіх месцаў — тэрыторыя Нарачы, Вілейскіх азёр, дзе размешчаныя адмыслова ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі: «Сарачанскія азёры», «Блакітныя азёры», «Швакшты», Нацыянальны парк «Нарачанскі», а таксама азёры Свір і Швакшты, дзе цяпер плануецца пабудаваць атамную станцыю.

***— Ігар Аляксандравіч, ці была нейкая рэакцыя на вашы звароты супраць будаўніцтва атамнай станцыі ў органы дзяржаўнага кіравання?***

— Не было. На маё імя ці нават проста на адрас заказніка ніякіх лістоў з адказам не прыходзіла. Мяркую, што там ведаюць пра маё звальненне. А калі няма чалавека, то і праблем няма.

***— За што вас звольнілі?***

— Не спадабаўся мой стыль працы. На працу ў заказнік «Сарачанскія азёры» я ўладкоўваўся з рэкамендацыямі ад экалагічных арганізацый. Да мяне там паўтара гады не было дырэктара. Як толькі прыйшоў працаваць, я адразу пачаў прасіць сродкі на заказнік, бо з мінулага года на развіццё не давалі грошы, а з гэтага — нават на ўтрыманне. Заказнік паступова абрастаў пазыкамі перад іншымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі і ўстановамі. Але ніводнага адказу на свае лісты я не атрымаў. Мой працадаўца — кіраўнік Астравецкага райвыканкама Адам Кавалька — нават ні разу не захацеў са мной сустрэцца, адпраўляў да куратара, які гаварыў: «Пацярпіце і працуйце далей». Напрыканцы сваёй працы я сам аплачваў утрыманне службовай машыны, якую, дарэчы, мне выдалі без пашпарту тэхагляду і страхоўкі. Я ўпэўнены, што аўтамабіль для мяне быў не раскошай, а



**Даведка:**

Ігар Пастухоў. Нарадзіўся ва Украіне, жыў у Вільнюсе. У 1982 годзе скончыў інстытут лясной гаспадаркі. Пачынаў працаваць з памочніка ляснічага. Тады ж правёў сваю першую акцыю па ўратаванні дубоў у Старадарожскім раёне. Арганізатар школы выжывання Survival, займаецца экалагічным турызмам, мастацкай фатаграфіяй. Жанаты, мае дваіх дзяцей.

неабходнасцю, бо праца патрабавала мабільнасці, а пад маім наглядам было 13 тысяч гектараў заказніка. Калі мы былі на тэрыторыі заказніка ў рэйдзе супраць браканьераў, нас спыніла ДАІ. За тое, што не было страхоўкі і тэхагляду, выпісалі штраф амаль на дзвесце тысяч рублёў. Яго я сплаціў са сваёй кішэні. Пры тым, што мой заробак вагаўся ад 239 да 400 тысяч рублёў.

Падчас сваёй працы на пасадзе дырэктара ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры» я стаў вывучаць дакументацыю па АЭС. І калі ўвайшоў у курс спраў, зразумеў, што магчымы толькі адзін з двух варыянтаў — ці АЭС ці заказнік. Паспрабаваў нешта зрабіць у абарону гэтых мясцін — і вось вынік.

Дарэчы, мяне звольнілі 17 ліпеня, а 16-га прыйшла вымова па нагоды за тое, што былі 30 чэрвеня я не знаходзіўся на працы, маецца на ўвазе, у канторы. У той дзень я сапраўды быў у лесе, на тэрыторыі, якая была ў маім падпарадкаванні.

***— Ці ёсць у вас навіны наконт таго, як ідуць справы ў заказніку пасля вашага сыходу?***

— У мяне складваецца ўражанне, што заказнік нікому цяпер непатрэбны. Я ведаю, што кантору заказніка перанеслі ў Астравец за 30 кіламетраў, гэта тое ж самае, калі б яе перанеслі ў Мінск ці іншую краіну — тэрыторыя будзе некантраляваная. Аднойчы намеснік міністра спорту і турызму Чэслаў Шульга выказаўся ў такім ключы: калі атамная станцыя патрэбная, то варта будаваць, і, на шчасце, гэта ў нас не апошні заказнік. Запаведнік у Беларусі толькі адзін — Бярэзінскі. Белавежская пушча — гэта Нацыянальны парк са статусам лясной паляўнічай гаспадаркі.

Астравеччына — адзін з самых чыстых куткоў Беларусі. Падобныя яму — Расонскі і Гарадоцкі раёны. Мы хвалімся, што 30 працэнтаў тэрыторыі — асабліва ахоўваемая. Але насамрэч у многіх месцах ідзе вырубка лясоў. Замежнікаў, якія прыязджаюць сюды за экатурызмам, цікавяць найперш драпежнікі і драпежныя птушкі. Але калі мы страцім аўтэнтычныя лясы — страцім і фаўну, бо на месцы пасадкі штучных плантацый мяняецца экасістэма. Знішчаючы свае лясы, мы робім палёгку канкурэнтам, падымаем іх прадукт — найперш маю на ўвазе Швецыю, Балгарыю, Славакію, Фінляндыю. З такім падыходам да спраў мы самі ўпусцім свой патэнцыял, самі выб'ем фундамент з-пад экалагічнага турызму.

Ва ўсіх заказнікаў ёсць тры агульныя праблемы. Першая: яны не маюць запаведнай тэрыторыі паводле заканадаўства. Гэта проста асабліва ахоўваемая тэрыторыя, дзе абмежаваныя некаторыя віды дзейнасці. Напрыклад, можна секчы дрэвы ўзростам сто год. У нацыянальных парках абмежаваныя амаль усе віды дзейнасці, застаецца толькі навуковая, экалагічная, турыстычная. Аднак і прырода можа прыняць толькі пэўную колькасць турыстаў. Я вырас на Блакітных азёрах. Раней за два тыдні там нікога можна было не пабачыць, цяпер за дзень можа прыехаць 20 аўтобусаў з турыстамі. Ці варта выязджаць з Мінска, каб аказацца ў гарадскім парку? У нас заказнікі пайшлі па шляху, калі на першае месца ставіцца мэта зарабіць, а пасля ахоўваць прыроду. Калі прыедзеце на возера Свіцязь, пабачыце вялікую колькасць адпачываючых, у парку «Браслаўскія азёры» — усе стаянкі забітыя. У польскім Паазер'і ёсць разлікі па колькасці магчымых турыстаў, але браць іх нам невыгодна, бо ў выніку можа атрымацца так, што зарабіць не атрымаецца.

Другое: лясгасы не пытаюцца, што ім можна рабіць на тэрыторыі заказніка. Калі б па закону тэрыторыя заказніка насамрэч была яго ўласнасцю, то і карціна была б іншай. Які сэнс у гэтай ахове? 30 працэнтаў тэрыторыі Беларусі ў большасці выпадкаў ахоўваецца намінальна, бо ніхто не пытаецца ў цябе дазволу на правядзенне тых ці іншых працаў.

Да таго ж заказнікі падпарадкоўваюцца Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а таксама мясцовым райвыканкамам — апошнія і нашы працадаўцы. Мы апынуліся паміж дзвюма кавадламі. Павінна быць падпарадкаванне Мінпрыродзе, заказнікі павінны быць уласнікамі. Міжнародная практыка паказвае, што ў ахове тэрыторыі ёсць сэнс, калі мінімум 50 працэнтаў тэрыторыі — запаведная. У нас — нуль. У заканадаўстве ёсць спасылка, калі ў заказніку ёсць нешта каштоўнае, то можа быць лакальная запаведная зона ў радыусе некалькіх сотняў метраў. Калі я працаваў дырэктарам ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры», знайшоў некалькі такіх зон, якія, перакрываючы адна адну, дазвалялі стварыць каля 25 працэнтаў запаведнай зоны. З маім сыходам гэта праца наўрад ці будзе працягвацца.

Між іншым, цяпер кіраўніцтва заказнікаў мае права прымаць свае рашэнні без узгаднення з мясцовымі органамі кіравання. Я лічу, што гэтым трэба максімальна карыстацца. Бо любое новаўвядзенне, калі ідзе на ўзгадненне, рызыкуе быць спушчаным на тармазах. Трэба быць гаспадаром, а не толькі дырэктарам на паперы.

***— Як мясцовыя жыхары рэагуюць на навіну пра магчымае будаўніцтва АЭС?***

— Прыязджалі спецыялісты з Акадэміі навук і пацвердзілі, што мясцовае насельніцтва (у раёне заказніка) супраць, але не ведаю, як будзе на паперы. Магчыма, тыя, хто жыве ў Астраўцы, і за будаўніцтва — будуць новыя працоўныя месцы. Але я ведаю, як гэтае «за» фарміруецца: у калгас прыязджаюць зацікаўленыя ў будаўніцтве чыноўнікі і адбываецца агітацыя, а не дыскусія. Расказваецца толькі пазітыўнае. Гэта тое ж самае, што даць мядзведзю інспектаваць пасеку. Але трэба разумець, што адразу павялічыцца колькасць насельніцтва на 30 тысяч чалавек. І ўсе яны будуць жыць фактычна ў заказніку, які гэтага папросту не вытрымае. Нават у абгрунтаванні будаўніцтва АЭС, падрыхтаваным «Белэнерга», гаворыцца, што будзе дэградацыя навакольнага асяроддзя ў радыусе 30 кіламетраў.

***— Канчатковае рашэнне аб будаўнітіце АЭС дагэтуль не прынята. Што падштурхнула разыкнуць пасадай?***

— Я вырас на прыродзе. Для мяне навакольнае асяроддзе насамрэч каштоўнае. Спачатку трэба навучыцца даваць прыродзе, а пасля, магчыма, ты нешта і атрымаеш. На гэтую працу я ішоў з мэтай нешта зрабіць. У гэтай сітуацыі мой статус прадугледжваў выбар. Я яго зрабіў, бо не маю намеру прадаваць сваю радзіму за трыдцаць атамных срэбнікаў.

***— Ці былі ў вас на працы аднадумцы?***

У мяне быў намеснік і бухгалтар. Але я не лез да іх са сваім меркаваннем. Падтрымку адчуў, толькі калі пайшла інфармацыйная хваля пасля маіх лістоў у дзяржорганы.

***— Што страціў заказнік у сувязі з інфармацыяй пра магчымае будаўніцтва АЭС на Астравеччыне?***

— Былі арганізацыі, гатовыя ўкласці грошы ў развіццё інфраструктуры, аднак у сувязі з патэнцыйным будаўніцтвам яны адмовіліся ад сваіх намераў. Людзі сказалі, што лепш інвестуюць грошы ў тых жа Вушаччах ці Расоншчыне. Я іх разумею. Яшчэ нічога не вырашана, аднак мы ўжо страцілі — іміджавыя страты самыя вялікія. Да канца мінулага года ніхто і падумаць не мог, што ў гэтым кутку Беларусі захочуць пабудаваць станцыю...

***— Ці будзеце ўдзельнічаць у кампаніях супраць пабудовы АЭС?***

— Хутчэй за ўсё, я б пагадзіўся. Але калі пад гэтым соўсам не будуць працягвацца нейкія палітычныя ідэі. Мяне цікавіць менавіта экалагічны аспект.

***— Шэраг недзяржаўных арганізацый цяпер ладзіць кампанію абмеркавання будаўніцтва АЭС. Як лічыце, ці будзе з гэтага плён?***

— Па закону, без грамадскіх слуханняў улады не маюць права прымаць рашэнне. У Астраўцы слуханні будуць у верасні, але магчымы варыянт з блытаннем даты, каб на іх не прыехалі падрыхтаваныя людзі. Тут трэба трымаць руку на пульсе і быць гатовым з'явіцца там у любы момант. Трэба паспрабаваць зрабіць усё магчымае для праўдзівага інфармавання насельніцтва, каб пасля не кусаць локці за нявыкарыстаныя шанцы. Я не думаю, што ва ўрадзе дурні. Яны павінны асэнсоўваць, што мы атрымаем і што згубім у выніку будаўніцтва атамнай станцыі на Астравеччыне.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 17 ЖНІЎНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.35** «Здароўе».
**10.00** Дак. фільм «Жарсці па бананах».
**11.00** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды» (Расія).
**12.10** Камедыя «Лёд у кававай гушчы» (Расія - Украіна).
**13.50** Відэафільм АТН «Гасцявыя калекцыі: Германія, Аўстрыя, Уэльс».
**14.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Прабач мяне». Відэафільм АТН.
**15.55** Дэтэктыўная драма «Капкан» (Расія).
**16.45** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**17.40** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды» (Расія).
**18.40** Відэафільм АТН «Мсціслаўскі шлях» цыкла «Зямля беларуская».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда». Фільм «Слёзы блазна».
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Каралева вышыні Алена Ісінбаева».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Адна сям'я». Шматсер. фільм.
**22.05** «Забіць змея». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.20** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Шырокая рака». Серыял.
**13.50** «Кіно»: Рэйф Файнс і Рэйчел Вайс у фільме «Адданы садоўнік».
**16.00** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Яфрэмавым.
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Ганна Банщыкава, Сяргей Гаробчанка і Аляксандр Носік у фільме «Танцуй». Расія.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».
**00.25** «Next». Серыял. Заключная серыя.

### ЛАД

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Гаспадар.
**08.40** У гэты дзень.
**08.45** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.45** Дакументальны серыял «Падмена». Фільм «115 літраў у секунду» (Беларусь).
**10.15** Лірычная камедыя «Пад сонцам Тасканы» (ЗША - Італія).
**12.10** Маладзевы дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША).
**12.55** «Грандыёзная гонка». Рэаліці-шоў.
**13.45** Дак. фільм «Вандраванне па вялікім гарбатным шляху» (Францыя). 1-я серыя.
**14.35** «У здаровым целе - здаровы дух». Відэафільм (Беларусь).
**14.45** Мультсерыял (Японія).
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Экспедыцыя.
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.10** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.05** Містычны серыял «Лялькі ведзьмака» (Расія).
**19.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**22.40** Экспедыцыя.
**22.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**23.40** Містычны дэтэктыў «Начны паляўнічы» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял.
**10.05** «Нягучнае кіно Барыса Барнэта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта» з Юрыем Мікалаевым і Ларысай Грыбалёвай».
**11.55** «Гарадок». Дайджэст.
**12.55** «Сталінградская бітва. Непераможныя». Фільм 1-ы. Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны Беларусь.
**14.20** Пакой смеху.
**15.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны Беларусь.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны ? Беларусь.
**19.30** Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** Тэлесерыял «Вышэйшы пілатаж».
**21.30** Тэлесерыял «Лініі лёсу».
**22.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
**22.45** Навіны Беларусь.
**22.55** «Весткі+».
**23.15** Серыял «Неадкладка-2».
**00.10** «Пра што маўчаў казачнік? Яўген Шварц». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**06.05** ІКанал «Сёння раніцай».
**08.05** Серыял «Толькі ты...».
**09.00** «Здані дома Раманавых» Дакументальны фільм.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Сярэдні клас».
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял.
**21.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.15** Сёння.
**23.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**00.05** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Гран-пры. HS 117.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 2.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. .
**15.00** Веласпорт. Гран-пры Гамбургу.
**16.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 2.
**18.30** Футбол. Еўрагалы.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 3.
**22.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету IAAF. Фотафініш. Берлін.
**23.15** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). Дзень 2.
**00.45** Вось дык так!!!
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 3.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Фотафініш. Берлін.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**20.10** На колах.
**20.35** Госць «Белсату»: Стэфан Эрыксан – амбасадар Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кірыла Тураўскі» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Дзённікі матацыкліста», маст. фільм, рэж. Вальтэр Салес, 2004 г., Германія–ЗША–Францыя–Вялікабрытанія–Мексіка–Перу–Аргентына–Чылі.
**23.20** Аб'ектыў (паўтор).

## 18 ЖНІЎНЯ, АЎТОРАК

### 1

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 1-я серыя.
**10.05** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды» (Расія), заключная серыя.
**11.35** «OFF STAGE LIFE» з Аляксандрам Саладухай.
**12.10** Прэм'ера. Маладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 1-я серыя.
**13.05** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**13.45** Маладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дак. цыкл «Эпоха».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўная драма «Капкан» (Расія).
**16.45** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**17.40** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды».
**18.40** Відэафільм АТН «Палескі раман « цыкла «Зямля беларуская».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**23.40** «OFF STAGE LIFE» з Мікалаем Мірным.
**00.00** Дзень спорту.
**00.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». Амедыя (Расія) пры ўдзеле Соні Пікчерс (ЗША), 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.15** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Кіно»: «Танцуй». Расія, 2006 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Жаданая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**14.40** «Гадкае качаня». Маладзевы серыял.
**15.30** «Уваскрэшанне класікі» з Аляксандрам Анісімавым. Дыялогі аб музыцы.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кобра. Антытэрор». Серыял.
**21.30** «Крот 2». Серыял.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.25** «Надзвычайныя гісторыі».
**00.20** «Next 2». Серыял.

### ЛАД

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.10** Дак.-біяграфічны серыял «Вялікія спакусніцы кіно». Даніэль Делорм (Францыя).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Містычны серыял «Лялькі ведзьмака» (Расія).
**11.00** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**11.50** Маладзевы дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША).
**13.15** «Грандыёзная гонка». Рэаліці-шоў.
**14.00** Дакументальны фільм «Вандраванне па вялікім гарбатным шляху» (Францыя). 2-я серыя.
**14.55** Мультфільм.
**15.15** Мультсерыял (Японія).
**16.00** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.05** Містычны серыял «Лялькі ведзьмака» (Расія).
**19.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**22.00** Экспедыцыя.
**22.05** Прыгодніцкі баявік
**23.35** Містычны дэтэктыў «Начны паляўнічы» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**10.05** «Паварот рэк. Спыніць апакаліпсіс». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
**11.45** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**12.40** «Гарадок». Дайджэст.
**12.55** «Сталінградская бітва. Непераможныя». Фільм 2-і. Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны Беларусь.
**14.20** «Лініі лёсу».
**15.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны Беларусь.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны ? Беларусь.
**19.30** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**21.30** «Лініі лёсу».
**22.30** Навіны Беларусь.
**22.40** «Весткі+».
**23.00** Яраслаў Бойка, Маргарыта Шубіна і Аляксей Дзякаў у серыяле «Неадкладка-2».
**23.55** «Таямніца егіпецкіх пірамід». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.05** Серыял «Толькі ты...».
**09.00** «Дачны адказ».
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.45** «Асабліва небяспечны!».
**11.20** Серыял «Ментоўскія войны».
**12.10** «Сярэдні клас».
**13.00** Сёння.
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял.
**21.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.15** Сёння.
**23.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда.
**01.30** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Фотафініш. Берлін.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 3.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 4.
**13.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 3.
**15.30** Скачкі на лыжах з трампліна.
**17.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 3.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 4.
**22.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**22.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна ЗША па версіі IBF. Цяжкая вагавая катэгорыя. Томаш Адамек (Польшча) - Бобі Ганн (ЗША).
**00.30** Аўтаспорт. Формула-2. Чэмпіянат свету.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 4.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.35** «Зберагчы спадчыну», 2008 г., Польшча.
**19.55** Побач з намі.
**20.20** Акно ў Еўропу.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.10** Еўропа сёння.
**22.35** Аб'ектыў (паўтор).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 19 ЖНІЎНЯ, СЕРАДА

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Слова Мітрапаліта.
**09.15** Дэтэктыўны серыял «Свой-чужы» (Расія). 2-я серыя.
**10.05** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія). 1-я серыя.
**11.40** «OFF STAGE LIFE» з Ганнай Эйсмант.
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 2-я серыя.
**13.05** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**13.45** Камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўная драма «Капкан» (Расія).
**16.45** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.40** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія). 2-я серыя.
**18.40** Відэафільм АТН «Паэмы Нясвіжскага кахання» цыкла «Зямля беларуская».
**19.30** Відэафільм АТН «Планета гольфа: Іспанія».
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 3-я серыя.
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоу.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**23.40** «OFF STAGE LIFE» з Вольгай Барабаншчыкавай.
**00.00** Дзень спорту.
**00.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Тэхнічная прафілактыка.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». Амедыя (Расія) пры ўдзеле Соні Пікчэрс (ЗША), 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.15** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Кобра. Антытэрор». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.30** «Дарагая перадача».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Жаданая». Серыял.
**13.50** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**14.15** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Крот 2». Серыял.
**16.50** «Нацыянальны здабытак». Гарады.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кобра. Антытэрор». Серыял. Заключная серыя.
**21.30** «Крот 2». Серыял.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Калі ласка, скардзіцеся».
**23.25** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**00.20** «Next 2». Серыял.

---

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.10** Дакументальна-біяграфічны серыял «Вялікія спакусніцы кіно».
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Містычны серыял «Лялькі ведзьмака» (Расія).
**11.05** Свая музыка.
**11.30** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**12.20** Моладзевы дэтэктыўны серыял «Вераніка Марс-3» (ЗША).
**13.50** «Грандыёзная гонка». Рэаліці-шоў.
**14.35** Дак. фільм «Вандраванне па вялікім гарбатным шляху». 3-я серыя, закл.
**15.25** Мультфільм.
**15.35** Мультсерыял
**16.00** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.05** Містычны серыял «Лялькі ведзьмака» (Расія). Заключная серыя.
**19.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
**22.45** Экспедыцыя.
**22.50** Містычны дэтэктыў «Начны паляўнічы» (ЗША).
**23.35** Хакей. Кубак Беларусі. Фінал.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**10.05** «Тунгускае нашэсце. 100 гадоў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**12.20** «Гарадок». Дайджэст.
**12.55** «Кацярына Фурцава. Жаночая доля». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Лініі лёсу».
**15.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**21.30** «Лініі лёсу».
**22.30** Навіны Беларусь.
**22.40** «Весткі+».
**23.00** Яраслаў Бойка, Маргарыта Шубіна і Аляксей Дзякаў у серыяле «Неадкладка-2».
**23.55** «Радавы праклён Гандзі». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.05** Серыял «Толькі ты...».
**08.55** «Руская сенсацыя»: «У крузе першых».
**09.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.20** Серыял «Ментоўскія войны».
**12.05** «Сярэдні клас».
**13.00** Сёння.
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял.
**21.25** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.15** Сёння.
**23.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**00.05** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 4.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 5.
**14.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 4.
**16.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). Дзень 3.
**17.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 4.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 5.
**22.45** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**23.15** «Формула-1». Часопіс.
**23.55** Выбранае па серадах.
**00.00** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.05** Навіны коннага спорту.
**00.10** Ветразевы спорт. Medcup (Італія).
**00.40** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.55** Выбранае па серадах.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 5.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.40** «Фокусная адлегласць», дак. фільм.
**20.05** Хто ёсць кім: Лісты з лесу Паўла Севярынца.
**20.20** Праект «Будучыня».
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Ямы», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
**23.05** Аб'ектыў.

## 20 ЖНІЎНЯ, ЧАЦВЕР

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25** Дзелавое жыццё.
**08.30** Відэафільм АТН «Памяранцавы бунт».
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Свой-чужы» (Расія). 3-я серыя.
**09.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія). 1-я серыя.
**11.30** «Альманах вандраванняў».
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 3-я серыя.
**13.05** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**13.45** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўная драма «Капкан».
**16.45** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.40** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія). 3-я серыя.
**18.40** «Зямля беларуская».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 4-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда». (Украіна). Фільм «Атар Кушанашвілі».
**00.20** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». Амедыя (Расія) пры ўдзеле Соні Пікчэрс (ЗША), 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.15** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Калі ласка, скардзіцеся».
**08.50** «Кобра. Антытэрор». Серыял. Заключная серыя.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Жаданая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Прыватныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Крот 2». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёр СТБ». Лепшае.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**21.30** «Крот 2». Серыял.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.25** «Гарачы лёд».
**23.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**00.45** «Next 2». Серыял.

---

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дакументальна-біяграфічны серыял «Вялікія спакусніцы кіно».
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Містычны серыял «Лялькі ведзьмака» (Расія). Заключная серыя.
**11.10** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**11.55** Моладзевы дэтэктыўны серыял «Вераніка Марс-3» (ЗША).
**13.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ліверпуль - Сток Сіці.
**15.10** Мультсерыял .
**15.55** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.05** Меладрама «Журботная дама чарвякоў» (Расія). 1-я серыя.
**19.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 6-ы. Прамая трансляцыя.
**22.30** Экспедыцыя.
**22.35** Час рыбалкі.
**23.05** Містычны дэтэктыў «Начны паляўнічы» (ЗША).
**23.45** Фантастычная камедыя «Чалавек з падвойным мозгам» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.25** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Руская серыя. Тэлесерыял «Вышэйшы пілатаж». 2009 г.
**12.20** «Джэнтльмен няўдачы. Рэжысёр Аляксандр Шэры». Дакументальны фільм.
**13.15** «Гарадок».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Лініі лёсу».
**15.15** Фільм «Будні і святы Серафімы Глюкінай». 1988 г. 1-я серыя.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.25** Руская серыя. Прэм'ера. Тэлесерыял «Вышэйшы пілатаж». 2009 г.
**22.25** Тэлесерыял «Лініі лёсу».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Новая хваля-2009». Трансляцыя з Юрмалы.
**02.15** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**10.05** «Раман з Карцавым». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**12.20** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**12.55** «Штурм Зімняга. Аспрэчанне». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Лініі лёсу».
**15.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**21.30** «Лініі лёсу».
**22.30** Навіны Беларусь.
**22.40** «Весткі+».
**23.00** Яраслаў Бойка, Маргарыта Шубіна і Аляксей Дзякаў у серыяле «Неадкладка-2».
**23.55** «Таямніцы сакрэтных пратаколаў». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

### EUROSPORT

**09.35** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 5.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 6.
**16.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 5.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 6.
**22.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**23.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/8 фіналу.
**23.45** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/8 фіналу.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 6.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 10 серыя.
**19.35** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.45** «Дарога на Вільню», дак. фільм.
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Курапаты – шлях сумлення», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.55** Форум (ток-шоу): «Ці лёгка быць маладым?»
**22.40** Аб'ектыў.

## 21 ЖНІЎНЯ, ПЯТНІЦА

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 4-я серыя.
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія). 3-я серыя.
**11.35** «OFF STAGE LIFE» з Ірынай Ітэйрай.
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 4-я серыя.
**13.05** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**13.45** Камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўная драма «Капкан» (Расія).
**16.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Апошні палёт Ігара Сорина».
**17.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія). 4-я серыя.
**18.40** «Зямля беларуская».
**19.30** Відэафільм АТН «Анёлы смерці» цыклу «Па-за законам».
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія). 5-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША- Вялікабрытанія).
**00.15** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету.
**01.45** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік». «Палюбоўнікі Вялікай Мядзведзіцы».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Курортны раман».
**22.45** «Легенды «Рэтра FM».
**00.15** Дэмі Мур у фільме «Вялікае пачуццё».
**01.55** Нашы навіны.
**02.10** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінршчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**09.40** «Гарачы лёд».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Жаданая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.35** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Крот 2». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Новыя вандраванні дылетанта».
**17.20** «Мінршчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** «Камедыя па пятніцах»: Не будзіце спячага сабаку». ЗША, 1996 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.45** «Для тых, хто не спіць»: «Паляўнічыя за розумам». ЗША, 2004 г.
**01.30** «Уцёкі». Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дакументальна-біяграфічны серыял «Вялікія спакусніцы кіно».
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Час футбола.
**10.40** Меладрама «Журботная дама чарвякоў» (Расія). 1-я серыя.
**11.35** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**12.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.20** «Грандыёзная гонка». Рэаліці-шоў (ЗША).
**14.05** Мультфільм.
**14.15** Мультсерыял (Японія).
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Школа рамонту.
**15.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.35** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.30** Дакументальны фільм (БТ).
**18.05** Меладрама «Журботная дама чарвякоў» (Расія). 2-я серыя.
**19.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**22.30** Экспедыцыя.
**22.35** Гістарычная эпапея «Мангол» (Расія - Казахстан - Германія).

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Карметіта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**10.05** «Пакрыўдзіць каралеву. Вія Артманэ». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г.
**12.20** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**12.55** «Забіць імператара. Англельскі след». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Лініі лёсу».
**15.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.




**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Карметіта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**22.20** Навіны Беларусь.
**22.30** «Каханы па найму». Расія, 2007 г.
**00.25** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.05** «Масква-Ялта-транзіт».
**09.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рэпарцёр У. Такменёў». Лепшыя фільмы.
**10.50** «Акопнае жыццё».
**11.15** Серыял «Ментоўскія войны».
**12.05** «Сярэдні клас».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял.
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**23.25** Драматычны трылер «Дрэйф».
**01.05** Фільм жахаў «Баль».

EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 7.
**13.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 6.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/8 фіналу.
**16.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 6.
**18.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**18.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 7.
**22.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**23.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/4 фіналу.
**23.45** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/4 фіналу.
**00.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**01.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 7.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў.
**19.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Плошча», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь.
**20.40** Госць «Белсату».
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Плямёны» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Бандыт», драма.
**22.45** Аб'ектыў.

## 22 ЖНІЎНЯ, СУБОТА

**06.25** Дакументальна-пазнавальны серыял (Францыя).
**06.50** Брытва Акама.
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.25** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Юры Айзеншпіс. Самотны геній шоў-бізнэсу».
**11.15** «OFF STAGE LIFE» з Андрэем Смаляком.
**11.30** «Будні чэмпіёнаў». Мастацкая гімнастыка. Частка 2-я.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Меладрама «Няскончаная аповесць» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН цыклу «Па-за законам».
**15.55** «Гасцявыя калекцыі: Расія, Чэхія, Швецыя». Відэафільм АТН.
**16.50** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Няроўныя шлюбы».
**17.45** Відэафільм АТН «Бабруйскі варыянт» цыкла «Зямля беларуская».
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Меладрама «Пясочны дождж» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Камедыя «Паштальён».
**23.40** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Еўропы (Іспанія). Кваліфікацыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Хто ў хаце гаспадар?». Амедыя (Расія), 2005 год.
**09.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Вія Артманэ. Каралева ў выгнанні».
**12.05** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».



**13.45** «Курортны раман. Небяспечныя сувязі».
**14.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва гарадоў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Суботні «Ералаш».
**16.30** Фільм «Лясун».
**18.30** Фільм «Лясун - 2».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Вясковая камедыя».
**23.00** Прэм'ера. Эдвард Радзінскі. «Здымацца кіно». Фільм 2-і.
**00.00** Фільм «Мужчына, які кахаў жанчын».

**06.10** «Анфас».
**06.25** «Турысты». Камедыйны серыял. Заключная серыя.
**07.15** «Сямейнае кіно»: «Вышэй вясёлкі». СССР, 1986 г.
**09.40** «Я - вандроўца».
**10.05** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**10.55** «Мінск і мінчукі».
**11.30** «Новыя вандраванні дылетанта».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.50** «Дарагая перадача».
**15.25** «Ваенная таямніца» з Ігарам Пракапенкам.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Малая Радзіма». Іванава.
**17.45** «Залатая калекцыя»: «Віват, гардэмарыны!». СССР, 1991 г. 1-я серыя.
**19.00** «Рэпарцёр СТБ». Лепшае.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Бобі». ЗША, 2006 г.
**22.25** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**00.05** «Арт-хаўс».
**01.30** «Уцёкі». Серыял.

**07.45** Мультсерыял «Трусы» (Вялікабрытанія).
**08.15** Дакументальна-пазнавальны серыял «Новыя храмы дзікай прыроды» (Францыя).
**08.45** Сусветная анімацыя. «Робін Гуд» (Вялікабрытанія).
**09.35** Школа рамонту.
**10.35** Ваенная драма «У чэрвені 41-га» (Расія).
**12.05** Сямейная камедыя «Дэніс-кат зноў наносіць удар» (ЗША).
**13.25** «Лабірынты: крэпасць над Днястром».
**13.55** Прэм'ера. Лірычная камедыя «Не прыспешвай каханне» (Украіна).
**15.50** Гісторыка-прыгодніцкі баявік .
**17.55** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Беларусь - Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
**19.50** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**22.00** Драма «Паляванне Ханта» (ЗША).
**23.50** Казанова.

РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** «За сям'ю пячаткамі».
**07.40** «Вандраванні натураліста».
**08.10** «Суботнік».
**08.50** «Ранішняя пошта» з Юрыем Мікалаевым і Ларысай Грыбалёвай».
**09.25** Фільм «Добры дзень, доктар!».
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.40** «Тэатр». 1-я серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**15.10** «Відавочнае-неверагоднае».
**15.45** «Кошт зорнай ролі». Дакументальны фільм.
**16.40** «Вясёлая хроніка небяспечнага вандравання».
**18.25** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**19.00** Весткі.
**19.20** «Суботні вечар».
**21.15** «Канец свету». Расія, 2006 г.
**01.05** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.15** Мультфільмы.
**08.55** «Агляд».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.50** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**14.00** Дэтэктыўны трылер «Пакой страчаных цацак».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Рэпарцёр У. Такменёў». Лепшыя фільмы.
**17.15** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.25** Самыя гучныя «Рускія сенсацыі»: «Рэпартаж з таго свету»; «Таемнае жыццё фашысцкіх правадыроў».
**21.15** Фільм «Каханне пад грыфам «Цалкам сакрэтна».
**23.15** Камедыя «Як рыбка без вады».

EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**10.00** «Формула-1». Часопіс.
**10.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 7.
**12.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 8.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/4 фіналу.
**16.00** Конны спорт. Турнір Global Champions. (Нідэрланды).
**17.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 8.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 8.
**22.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**22.30** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/2 фіналу.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Чэхія. Дзень 1.
**00.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**01.30** «Формула-1». Часопіс.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 8.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** МакраФон: «Права быць свабодным» – канцэрт альтэрнатыўнай музыкі – Луцк-2007, ч. 3: выступ гуртоў «Зніч» і «Тав. Маўзер».
**19.45** Чалавек-эпоха: «Кароль Уга», дак. фільм, рэж. Франка дэ Пэна, 2007 г., Польшча.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**21.40** «Дэтэрмінатар», серыял: 7 серыя.
**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**22.50** Аб'ектыў.

## 23 ЖНІЎНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.25** Дакументальна-пазнавальны серыял (Францыя).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Барбара Брыльска».
**10.55** Усе стыхіі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** Эксцэнтрычная камедыя «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Каапецыя» (СССР).
**13.55** Nota Bene.
**14.25** Навіны.
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Еўропы (Іспанія). Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Кошт поспеху».
**17.45** Суперлато.
**18.40** Меладрама «Кактус і Алена» (Расія - Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоу.
**21.00** «Панарама тыдня» з Юрыем Гоеравым.
**22.05** Футбол. Відэачасопіс Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**22.35** Містычны трылер «Інтэрв'ю з вампірам» (ЗША).
**00.50** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Фіналы.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.15** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?».
**09.45** «Шалапутныя нататкі» з Дзмітрыем Крыловым.
**10.05** Пакуль усе дома.
**10.55** Фазэнда.
**11.30** Па абодва бакі жыцця».
**12.30** «Геніі і злыдні».
**13.00** Нядзельныя «Ералаш».
**13.10** Прэм'ера. «Скарб нацыі».
**14.05** Камедыя «Паляўнічыя за прывідамі. 5 гадоў праз».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Авіяслалам. Чэмпіянат свету».
**17.20** Музычны фэст.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** Фільм «Ад 180 і вышэй».
**23.55** Фільм «Прыродны дар».

**06.25** «Праверана на сабе».
**07.10** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**08.00** «Кіно»: .
**09.30** «Добы дзень, доктар!».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Аўтапанарама».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.45** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Ефрэмавым.
**15.15** «Рэтраманія».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Прыватныя гісторыі».
**17.20** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**17.45** «Залатая калекцыя»: «Віват, гардэмарыны!». СССР, 1991 г. 2-ая серыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** «Фільм тыдня»: «Як ажаніцца і застацца халастым». Францыя, 2006 г.
**22.15** «Спартовы тыдзень».
**22.35** СТБ прадстаўляе - «Кіназдымкі».
**00.05** «Уцёкі». Серыял.

**08.05** Мір вашаму дому.
**08.15** Мультсерыял «Трусы» (Вялікабрытанія). Заключныя серыі.
**08.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Новыя храмы дзікай прыроды» (Францыя).
**09.15** Музычная камедыя «Труфальдзіна з Бергама» (СССР). 1-я і 2-я серыя.



**11.30** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**12.05** Пасоўванне+.
**12.20** Дэтэктыўная меладрама «Патэлефануй у маі дзверы» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**15.40** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**17.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Дзень 9-ы. Прамая трансляцыя.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) - «Дынама» (Мінск). Прамая трансляцыя.
**21.35** Экспедыцыя.
**22.05** Прэмія «Оскар». «Правілы вінаробаў» (ЗША).
**00.15** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**00.30** Свая музыка.

**07.00** Гірт Якаўлеў у фільме «Вей, ветрык!».
**08.35** «Вясёлая хроніка небяспечнага вандравання».
**10.05** «Мой срэбны шар. Ірына Пячэрнікава».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Гарадок.
**12.40** Тэатр». 2-я серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**15.15** Дакументальны фільм.
**16.15** Фільм «Былы тата, былы сын».
**18.00** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі.
**19.20** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**19.55** Марына Якаўлева і Сяргей Селін у фільме «Выбар маёй матулі». Расія, 2008 г.
**21.50** Дэтэктыў «Чорны квадрат».
**00.05** Фільм «Былы тата, былы сын».

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі мір» з Цімафеем Бажэнавым.
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.45** «Змаганне за ўласнасць».
**11.20** «Жаночы погляд» Аксаны Пушкінай. Ірына Ланчына.
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Калашнікаў: зброя разладу». Фільм Сяргея Халашэўскага.
**14.10** Прыгодніцкі баявік «Рыцары неба».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Рэпарцёр У. Такменёў». Лепшыя фільмы.
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.00** Вострасюжэтны серыял «Павуцінне: куля справядлівасці».
**23.40** «Футбольная ноч».
**00.10** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

**09.30** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). 1/2 фіналу.
**10.30** «Формула-1». Часопіс.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 8.
**12.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 9.
**14.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Украіна - Нідэрланды. Турку (Фінляндыя).
**16.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Чэхія. Дзень 2.
**17.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 9.
**19.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Фінляндыя - Данія. Турку (Фінляндыя).
**21.30** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.
**22.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Берлін. Дзень 9.
**23.30** Тэніс. Турнір WTA. Таронта (Канада). Фінал.
**00.30** Аўтагонкі.
**01.00** Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ. Валенсія (Іспанія).
**02.00** Лёгкая атлетыка. Фотафініш. Берлін.

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 15 серыя.
**20.05** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008», ч. 3: канцэрт гурта «Dali».
**20.20** «Атамны полк», дак. фільм, рэж. Зоя Катовіч, 2008 г, Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Цёмнасіні, амаль чорны», мастацкі фільм, рэжысёр. Даньель Санчэс Арэвала 2006 г., Іспанія.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.

(сумма прописью)

Кому Куда — Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________ (почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня
Всего

Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня
Всего

Кассир

ЦІКАВА

# КАНЦЭРТ, ЯКІ ЗРАБІЎ АБАМУ ПРЭЗІДЭНТАМ




Іван БІЧ

**15 жніўня 1969 года адбыўся канцэрт, які стаў сімвалам эпохі і змяніў ход гісторыі. Мова пра славуты Вудсток.**



«Маладыя людзі, якія маюць капітал, шукаюць легальныя магчымасці інвестыцый», — такая аб'ява з'явілася напрыканцы 1968 года ў «New York Times» і «Wall Street Journal». Аб'яву замовілі 20-гадовыя Джон Робертс і Джоэль Розэнман.

Адгукнулася каля тысячы чалавек, аднак адбор прайшлі толькі 22-гадовы Майкл Ланг і Арці Корнфілд. Спачатку яны прапанавалі маладым мільянерам заснаваць курсы мастацкага навучання, аднак потым узнікла ідэя правесці самы буйны фестываль у гісторыі. Як пазней згадваў Ланг, ідэя была вельмі простай — сабраць у адным месцы самых вядомых музыкаў.

Спачатку трэба было сабраць зоркавы склад і знайсці месца для канцэрту. З выступоўцамі быццам праблем не было. У спісе тых, хто пагадзіўся ўдзельнічаць у фестывалі, былі такія зоркі, як Джэніс Джоплін, Джымі Хендрыкс, Джо Кокер, Джоан Баэз, групы «Jefferson Airplane», «The Who», «Creedence Clearwater Revival» і іншыя.

А вось з пляцоўкай было больш праблем. Муніцыпалітэты маленькіх гарадоў вакол Нью-Йорку нават чуць не хацелі пра канцэрты для хіпі. На той час ЗША яшчэ не адышлі ад выхадкі банды маньяка Чарльза Мэнсана, які забіў сям'ю галівудскіх акцёраў. Мэнсан быў тыповым хіпі, паколькі жыў у камуне, слухаў рок і захапляўся нетрадыцыйнай рэлігіяй.

Сітуацыю выратаваў фермер з-пад гарадку Бетэл. За 75 тысяч долараў ён пагадзіўся аддаць пад канцэрт сваё поле, нягледзячы на тое, што суседзі адмовіліся купляць яго малако. Прычым як фермеру, так і мясцовым уладам арганізатары схлусілі. Заявілі, што людзей будзе не больш за 50 тысяч чалавек. На самай справе, спачатку планавалася куды больш. Толькі напярэдадні канцэрту было прададзена 186 тысяч білетаў па 18 долараў кожны. Яшчэ 200 тысяч планавалася прадаць непасрэдна падчас шоу. Ланг і тусоўка лічылі барышы, калі пачаліся, мякка кажучы, праблемы.

Зранку 15 жніўня ў бок Бетэла рушыла калона машын. Хутка ўзнікла пробка на 30 кіламетраў. Сотні тысяч чалавек часам суткамі стаялі ў калоне. Аднак на гэты час прыкладна 200 тысяч чалавек ужо дабраліся да месца канцэрту. Чакаць у доўгіх чэргах яны не жадалі, тым больш, што канцэрт ужо пачаўся. Хутка платы былі зламаныя. Лангу заставалася рабіць добрую міну пры дрэннай гульні: выйсці да мікрафону і зрабіць аб'яву пра тое, што канцэрт будзе «на халяву».

Гэтым справа не скончылася — хаос перакінуўся за кулісы. Галоўныя прычына — музыкаў з-за аўтамабільных пробак прыйшлося дастаўляць на верталётах. У выніку імпрэза пачалася на некалькі гадзін пазней, а перапынкі паміж выступамі часам цягнуліся да 17 гадзін (!).

Паколькі публіцы рабіць часам было няма чаго, яна ахвотна ўжывала наркотыкі, займалася сексам і папросту адпачывала. Спаць даводзілася тут жа на зямлі. Гэта прывяло да няшчаснага выпадку: трактар фермера зранку пераехаў чалавека. Гэта была другая ахвяра фестывалю. Першай стаў адзін наркаман, які прыняў вялікую дозу гераіну. А на закуску пад напорам натоўпу рухнула сцэна.

Вось такія былі знешнія вынікі Вудстоку. Напэўна, вечарам 17 жніўня 1969 года арганізатары фестывалю адчувалі сябе самымі няшчаснымі людзьмі ў свеце. Праект, у які яны ўклалі амаль усе свае грошы, ляснуўся.

Аднак сітуацыя хутка пачала мяняцца. Ранішні выпуск «New York Times» выйшаў з рэпартажам з Вудстоку. Яго аўтар напярэдадні меў вялікі канфлікт з рэдактарам, які патрабаваў ад яго артыкул пра секс, наркотыкі, аўтамабільныя пробкі, антысанітарыю. Журналіст жа акцэнтаваў увагу на іншым. Для яго галоўным вынікам Вудстоку была незвычайная атмасфера гармоніі і салідарнасці паміж маладымі людзьмі.

Акрамя таго, журналіст звярнуў увагу, што ўдзельнікамі Вудстоку была моладзь левых поглядаў, патэнцыйныя чытачы прагрэсіўнай «New York Times». Рэдактар пагадзіўся і паставіў артыкул на старонку. Так пачалося стварэння легенды.

На наступны дзень па тэлебачанні паказалі talk-show Дзіка Кэвета, якое глядзела ўся краіна. На праграму былі запрошаныя сябры групы «Jefferson Airplane», удзельнікі канцэрту. Яны прадставілі Вудсток у самых пазітыўным выглядзе.

Апошнюю цагліну ў фундамент міфалогіі Вудстоку заклаў дакументальны фільм «Вудсток — тры дні міру і музыкі», які выйшаў праз год. Фільм атрымаў Оскара і прынёс стваральнікам 16 мільёнаў долараў (сабекошт карціны — 100 тысяч долараў).

З тых часоў Вудсток — не толькі легенда, але і бізнес. Літаральна кожны год Ланг і яго кампанія арганізоўваюць які-небудзь фестываль пад брэндам «Вудсток». У гэтым годзе яны нават арганізавалі сусветны тур. Варта згадаць, што арганізатарам Вудстоку давялося да пачатку 1980-х плаціць па даўгам за той легендарны канцэрт. Яны ўляцелі прыблізна на тры мільёны долараў.

Вудсток зламаў ход гісторыі. На нейкі час маладыя людзі альтэрнатыўных поглядаў апынуліся ў адным месцы. Яны адчулі сваю сілу, атрымалі імпульс да змен у грамадстве. Выступ Джымі Хендрыкса, які сыграў амерыканскі гімн, стаў сімвалічным актам нараджэння новай Амерыкі. Не дзіўна, што тыя гады сталі зенітам студэнцкага і грамадзянскага руху ў ЗША. «Самы вялікі грамадскі мірны эксперымент усіх часоў», — пісаў вядомы музычны часопіс «Rolling Stone» пра тры дні ў Вудстоку.

Ці была б такой Амерыка сёння, калі б не Вудсток? Ветэраны Вудстоку кажуць: «Не». Прынамсі, па іх словах, Барак Абама без Вудстоку ніколі б не быў прэзідэнтам.

А гарадок Бетэл даўно ўжо жыве дзякуючы турыстам, якія едуць сюды з усіх канцоў свету, каб паглядзець на месца легендарнага Вудстоку.

АБ'ЯВА

### 40 год Вудстока

Шырока вядомы кампазітар і гітарыст «Алгарытмаў» і «Верасоў», кіраўнік мінскага «Стар-клуба» і адзін з пачынальнікаў біт-фестываляў у Беларусі Генадзь Старыкаў, арганізуе святкаванне 40-годдзя Вудстока. 15 жніўня ў Мінску ў Доме культуры ветэранаў на вуліцы Янкі Купалы, а 19.00 зайграюць і заспяваюць сапраўдныя «ветэраны» — сам Генадзь Старыкаў, Вольга Арыпава, гурт «Зодчие», а таксама музыкі наступных пакаленняў — Юрый Міхайлаў з «Мадэрай Хард Блюз», гурт «Артэфакт», дуэт на чале з Аляксандрам Дзеркачом. Як і на Вудстоку, прагучаць і легендарныя кампазіцыі «The Beatles».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Лукашэнка вельмі баіцца мяняць стаўленне да саюзніка-донара. А донар больш не хоча датаваць непаслядоўнага (з пункта гледжання Крамля) палітыка, які цягне коўдру на сябе. Расія патрэбна Беларусь. Але прысутнасць Лукашэнкі не з'яўляецца для расійскіх уладаў абавязковай. Пасля ўсіх істэрычных выхадак, якія дазволіў сабе Лукашэнка за апошнія тры гады, ён не можа разлічваць на падтрымку свайго рэжыму з боку Расіі. У прынцыпе, калі б беларускі народ прывёў да ўлады іншага лідэра, накіраванага на адэкватныя адносіны з Расіяй, шмат хто ў Крамлі ўздыхнуў бы з палёгкай. Верагодна, гэта разумее і сам Лукашэнка. Таму і стварае новае ведамства, каб кантраляваць найбольш пасіянарную частку грамадства.

**«Сегодня» (Расія)**

Расійская сіла зброі мела негатыўныя наступствы. Незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі прызнаная Расіяй і Нікарагуа. І ўсё. Размахванне вялікай дубінай на Каўказе прывяло ў блізкім замежжы да наступстваў, процілеглых ад задуманых. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які многія гады быў самым блізкім саюзнікам Масквы, загадаў сваім дыпламатам наладзіць больш шчыльныя адносіны з Захадам.

**«The Guardian» (Вялікабрытанія)**

Калі б прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі або ўцягванне ў сярэднеазіяцкія праекты абяцала б Мінску істотныя выгоды, то погляды Лукашэнкі былі б іншымі. Таму тое, што відавочна для Масквы, для Мінска не ясна. І рабіць з гэтага далёка ідучыя геапалітычныя высновы пра пераарыентацыю Беларусі на ЗША і ЕС наўрад ці мэтазгодна. Нават краіны Варшаўскай дамовы ў перыяд «дактрыны Брэжнева» дазвалялі сабе самастойнасць (Румынія ў 1968 годзе не падтрымала ўвод войскаў у Чэхаславакію, а ў 1984 годзе — байкот Алімпіяды ў ЗША, венгерскія лідэры выбудоўвалі свае адносіны з МВФ, а палякі мелі іншую ад СССР рэлігійную палітыку). У гэтай сувязі лічыць, што знешняя палітыка Мінска можа быць аднолькавая з палітыкай Масквы, — памылка.

**«Политком.ру» (Расія)**

Як адзначаюць некаторыя крыніцы, прэзідэнт Беларусі быццам бы паабяцаў паставіць свой подпіс пад дакументам аб стварэнні КСОР, не высоўваючы пры гэтым «адмысловых умоў». Але верыць падобным абяцанням Лукашэнкі не варта. Нават калі ён не будзе гандляваца, звязваючы пытанне аб калектыўнай бяспецы з беспераШкоднымі допускам беларускіх тавараў на расійскі рынак (што малаверагодна), то ў яго заўсёды ёсць у запасе яшчэ адна адгаворка: па канстытуцыі, беларускія вайскоўцы не могуць прымаць удзел у ваенных аперацыях за мяжой рэспублікі. Калі ж гіпатэтычна дапусціць, што АДКБ пойдзе насустрач Беларусі і пагодзіцца на тое, што рэспубліка не будзе ўдзельнічаць у КСОР «фізічна», а акажа гэтым сілам толькі маральную падтрымку, то нават такі варыянт можа дорага абысціся Лукашэнку: Захаду не спадабаецца яго ўдзел у праекце «анты-NATO».

**«Главред» (Украіна)**

Эксперты спрачаюцца пра мэтазгоднасць стварэння адзінага следчага камітэта, які, мяркуючы па ўсім, будзе дубляваць функцыі пракуратуры. Ва ўмовах фінансавага крызісу і масавага звальнення працаўнікоў бюджэтных структур з'яўленне новай дзяржструктуры выглядае дзіўна. Як лічаць эксперты, праект суперкамітэта, падпарадкаванага непасрэдна прэзідэнту, узнік не толькі ў сувязі з незадаволенасцю кіраўніка дзяржавы дзейнасцю пракуратуры, але і таму, што Аляксандр Лукашэнка не даверае свайму асяроддзю. Новая структура дазволіць спадару Лукашэнку ўсталяваць поўны кантроль над праваахоўнымі структурамі і пазбегнуць нечаканасцяў з іх боку.

**«Коммерсант» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ. УСХОДНІЯ НЕМЦЫ — ГАРМАТНАЕ МЯСА

Якія толькі тэмы не ўздымаюць палітыкі, каб атрымаць галасы выбаршчыкаў. Так, сацыял-дэмакраты і прадстаўнікі Партыі «Левыя» напярэдадні вераснёўскіх выбараў у Бундэстаг узнялі скандал вакол становішча салдат з Усходняй Германіі ў нямецкім войску. Актывісты тых партый сцвярджаюць, што ў фармаваннях бундэсвера, якія выконваюць небяспечныя замежныя місіі, непрапарцыйна шмат выхадцаў з былой ГДР. Адсюль высноіва: осі (мянушка ўсходніх немцаў) выкарыстоўваюцца весі (заходнія немцы) у якасці гарматнага мяса. Адзін з лідэраў сацыял-дэмакратаў Саксоніі нават заявіў, што саксонскі дыялект стаў своеасаблівай візітнай карткай атрадаў вайсковага спецназу. Сітуацыя сапраўды вельмі цікавая. Усходнія немцы складаюць 20 працэнтаў насельніцтва ФРГ, аднак у вайсковых фармаваннях за межамі Германіі яны складаюць прыкладна 60 працэнтаў (каля 6 500) ад колькасці салдат. Правыя партыі кажуць, што ў гэтым няма нічога дзіўнага: у войску ЗША таксама шмат этнічных мексіканцаў і афраамерыканцаў, для якіх з-за дрэннай адукацыі, армія — адзіны сродак зрабіць кар'еру. А прадстаўнік Партыі зялёных звярнуў увагу на вялікія маштабы правага экстрэмізму ў рэгіёне. 74 працэнты маладых усходніх немцаў гатовы на гвалт супраць іншаземцаў, хаця тыя ў былой ГДР складаюць толькі 2 працэнты насельніцтва. Не дзіўна, што людзі з падобнымі комплексамі ахвотна ідуць служыць у часткі, якія нясуць службу ў гарачых кропках планеты.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### УКРАІНА. КІРМАШ БЕЗ ПАЛІТЫКІ




Улады Палтаўскай вобласці прынялі рашэнне забараніць размяшчэнне палітычнай рэкламы на Сарочынскім кірмашы, які стартуе 18 жніўня. Сарочынскі кірмаш штогод збірае дзесяткі тысяч удзельнікаў. Мерапрыемства асвятляюць амаль усе вядучыя СМІ Украіны. А зараз у краіне пачынаецца кампанія па выбарах прэзідэнта, якія прызначаны на студзень 2010 года. Натуральна, шмат хто з кандыдатаў хацеў бы выкарыстаць кірмаш для піяру. Таму глава Палтаўскай абласной адміністрацыі заявіў, што не дапусціць, каб кірмаш ператварылі ў агітацыю. Будуць забаронены ўсялякія білборды з рэкламай таго ці іншага кандыдата. «Кірмаш існуе для адпачынку і гандлю», — сцвярджае чыноўнік. Аднак некаторыя палітыкі ўсё роўна заявілі, што будуць удзельнічаць у кірмашы. Тым больш, што галасы жыхароў Палтаўшчыны, і ўвогуле цэнтру Украіны, звычайна вырашаюць лёс выбараў.

**Па матэрыялах «День» (Украіна)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ЖАХІ З УДЗЕЛАМ ЗОРАК




У Вялікабрытаніі назіраецца бум папулярнасці кніг жанру horror (англ.: «жах»), героямі якіх, аднак, ёсць не выдуманыя персанажы, а вядомыя публічныя асобы. На мінулым тыдні на рынку з'явілася новая кніга з гэтай серыі. Раман Алана Голдшэра «Пол — гэта жывы нябожчык, або Брытанская атака зомбі». Сюжэт можа падацца абсалютным абсурдам: вядомы ўдзельнік гурту «The Beatles» Джон Ленан становіцца ахвярай вампіра і ператвараецца ў зомбі. Калі ён сустракае Пола Маккартні — высмоктвае ў яго мозг. Падобны лёс пазней сустракае і Джон Харысан. Здавалася б, падобная літаратура можа зацікавіць толькі вар'ятаў. Але прыгоды Ленана карыстаюцца вялікім попытам. Выдавецтва запланавала выпусціць да ліпеня наступнага года сем кніжак пра прыгоды вядомых асоб, якія ператварыліся ў зомбі. Больш таго, мода на падобныя кніжкі перайшла акіян. У Штатах вядомаму пісьменніку Сет Грахэйм-Сміту замовілі кнігу «Абрахам Лінкальн — паляўнічы за вампірамі». Літаратар атрымае за яе ганарар у паўмільёна долараў.

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

ПАРАДОКС

# САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА ІСПАНІІ І ПАРТУГАЛІІ

*Алег НОВІКАЎ*



**Беларусы, як сведчаць дадзеныя сацыялагічных апытанняў, усё больш абыякава ставяцца да ідэі саюзу з Расіяй. У той час, як партугальцы, якіх лічаць малодшымі братамі іспанцаў, быццам не супраць стварыць з Мадрыдам саюзную дзяржаву.**

Праблема ў тым, што, як паказваюць вынікі апытанняў, самі іспанцы не вельмі хочуць яднання. Увогуле, згаданыя апытанні сталі першымі іспанска-партугальскімі даследаваннямі па праблеме стаўлення грамадзян абедзвюх краін да магчымага саюзу.

Аднак трэба адзначыць, што сама ідэя аб'яднання Іспаніі і Партугаліі ўзнікла не сёння, і нават не ўчора.

Пачаць ёсць сэнс з таго, што партугальцы і іспанцы маюць раманскія карані. Мова і культура ў іх вельмі блізкія. Больш таго, некаторы час народы жылі ў адной дзяржаве.

Усё пачалося ў 1578 годзе. Партугальскі кароль Себасцьян падтрымаў групу дысідэнтаў з Марока, якія былі незадаволеныя сваім каралём. Лісабон вырашыў скарыстацца сітуацыяй, і нават захапіць Марока. Дэсант партугальцаў і іх саюзнікаў скончыўся катастрофай. У так званай «Бітве трох каралёў» інтэрвенты былі разбітыя, а сам Себасцьян таямніча знік. Апошні раз яго бачылі, калі ён у авангардзе партугальскай арміі атакаваў арабаў.

Невядомы лёс манарха нарадзіў легенду пра тое, што Себасцьян жывы. Больш таго: хадзілі чуткі, што ён вось-вось вернецца і навядзе парадак. Міф пра «караля, які спіць» (так празвалі Себасцьяна) перажыў часы сярэднявечча. Узнікла цэлая канцэпцыя — себасцьянізм — гераічны чын у імя радзімы і рэлігіі. Менавіта абапіраючыся на ідэі себасцьянізму партугальская калонія Бразілія, пасля таго, як метраполія ў 1889 годзе перайшла на рэспубліканскі лад, абвясціла ў сябе манархію. Некалькі народных паўстанняў у Бразіліі таксама праходзілі пад лозунгамі вяртання «караля, які спіць».

Але вернемся да тэмы. Паколькі сам Себасцьян знік, а блізкіх родзічаў у яго не было, у краіне пачаўся дынастычны крызіс. Іспанскі кароль Філіп як дзядзька Себасцьяна сеў на партугальскі трон. Так узнік Іберыйскі Саюз. Сістэма была падобная на Каралеўства Польскае і ВКЛ пры Ягайлу. Існавала персанальная унія, калі на дзве фармальна незалежныя дзяржавы быў адзіны кароль. У 1640 годзе пры падтрымцы кардынала Рышэльэ герцаг Хуан Браганскі аднавіў партугальскую манархію.

Ідэя саюзу Іспаніі і Партугаліі зноў узнікла на пачатку XIX стагоддзя. Яе галоўным папулярызатарам стаў іспанскі асветнік Хасэ Марчэна. З яго ініцыятывы значная частка лібералаў Іспаніі занялася агітацыяй за стварэнне іберыйскай федэрацыі на прынцыпах рэспублікі.

Канцэпцыя набыла яшчэ больш прыхільнікаў падчас вайны з Напалеонам, прычым на гэты раз у колах манархістаў. На канстытуцыйнай асамблеі ў Кадысе ў 1810 годзе абмяркоўваўся варыянт стварэння адзінай іспанска-партугальскай дынастыі.

Сярэдзіна XIX стагоддзя — залаты час іберыйцаў. Яны, здавалася б, поўнасцю былі падрыхтаваныя да стварэння саюзнай дзяржавы. Было нават вырашана, што сталіцай будучай федэрацыі мае быць Мерыда (Іспанія), якую заснаваў рымскі імператар Дыялектыян у 287 годзе. У 1854-м іберысты прыдумалі сабе сцяг: чатыры роўных чатырохкутніка белага, чырвонага, сіняга і жоўтага колеру. Цікава, што іберыйскі штандар старэйшы за сцягі цяперашняй Партугаліі і рэспубліканскай Іспаніі.

У чэрвені 1873 года рэспубліканцы захапілі ўладу ў Мадрыдзе. Іспанія была абвешчана федэральнай рэспублікай — першы крок да федэралізацыі ўсёй Іберыі. Спецыяльная камісія пачала працу над канстытуцыяй. У суседняй Партугаліі таксама пачаўся грамадскі рух за федэралізацыю краіны і паступовае аб'яднанне з суседзямі. Аднак вайна з карлістамі, а потым вайна з ЗША з-за Кубы прымусілі Мадрыд забыць пра праект федэрацыі.

Затое ідэі іберызму пачалі актыўна эксплуатаваць малыя этнасы, кшталту баскаў або каталонцаў. Для іх іберыйская федэрацыя — крок да поўнай незалежнасці. Калі ў 1931 годзе была абвешчана Каталонская аўтаномна рэспубліка, яе статус быў сфармуляваны наступным чынам: «Каталонская дзяржава, інтэграваная ў федэрацыю іберыйскіх рэспублік».

Іншымі, хто застаўся прыхільным іберыйскаму праекту, былі анархісты і сацыялісты. Іх арганізацыі мелі не нацыянальны, а наднацыянальны характар, кшталту Іберыйскай федэрацыя анархістаў або Саюзу маладых сацыялістаў Іберыі. Аднак пасля перамогі Франка ў 1936 годзе левыя вымушаны былі сысці ў падполле, дзе пра Іберыю забыліся.

Не меў попыту на рынку палітычных праектаў іберызм і пасля падзення дыктатуры. Тым больш, што пасля ўступлення Іспаніі і Партугаліі ў ЕС межы паміж імі носяць фармальны характар.

Аднак, як аказваецца, у іберыстаў ёсць досыць добры патэнцыял. 29 ліпеня ў газеце «El País» былі апублікаваныя вынікі згаданых вышэй сацыялагічных даследаванняў. Адпаведна ім, 40 працэнтаў партугальцаў падтрымліваюць ідэю стварэння Іберыйскай федэрацыі. 34 працэнты супраць таго, каб паступацца суверэнітэтам. Сярод іспанцаў праект федэрацыі знайшоў падтрымку ў 30 працэнтаў, такая ж колькасць рашуча выступае супраць.

Пра тое, што сімпатыі да Іспаніі сярод партугальцаў дастаткова моцныя, сведчаць і апытанні на памежныя тэмы. Так, палова грамадзян Партугаліі выступае за абавязковае выкладанне іспанскай мовы ў школах. Калі б партугальскім бацькам прапанавалі самім абіраць, якую мову будзе вывучаць іх дзіця ў рамках прадмету «замежная мова», 85 працэнтаў з іх аддалі перавагу на карысць іспанскай. Палова партугальцаў кажуць, што гатовыя прызнаць іспанскага манарха Хуана Карласа як свайго караля.

Тое ж самае адбываецца ў сферы эканомікі. За стварэння агульнай з Іспаніяй падатковай сістэмы і агульных правіл для працоўнага рынку выступаюць адпаведна 59 і 72 працэнта насельніцтва Партугаліі.

Аднак самае цікавае, што партугальцы пры гэтым, як сведчаць тыя ж дадзеныя сацыёлагаў, працягваюць ціха ненавідзець Іспанію.

Як бачым, ідэя іберызму зрабіла дзіўную траекторыю. Яна нарадзілася ў імперскім Мадрыдзе як сродак мяккай інкарпарацыі Партугаліі ў склад Іспаніі. Аднак у выніку глабалізацыі цэнтр іберыйскага руху змясціўся ў Лісабон, дзе сёння гэтую ідэю разумеюць як сродак узняць эканамічны ўзровень за кошт іспанцаў.

МЕРКАВАННЕ

# ТРЭЦЯЯ КАЎКАЗСКАЯ, або РАЗБОРКІ Ў СТЫЛІ 1990-Х

**Літаральна кожны дзень з Паўночнага Каўказа прыходзяць навіны пра бойкі паміж федэраламі і баевікамі. Апошняя зводка: 12 жніўня ва ўласным кабінеце (!) быў забіты міністр будаўніцтва Інгушэціі Руслан Амерханаў. Што адбываецца? Куды глядзяць Пуцін і Мядзведзеў? Прапануем падборку каментараў расійскіх юзераў на гэту тэму.**



• Дапускаю, што міністра будаўніцтва забілі ў ходзе (анты)карупцыйных разборак. Аднак мяркую, што адным з галоўных фактараў нестабільнасці на Каўказе ёсць Кадыраў.

• Асноўны фактар нестабільнасці на Каўказе — амерыканскі ўрад у Іраку.

• Каўказ заўсёды кіпеў. Суседзі ў Чачні — Інгушэція і Дагестан — вельмі далёкія ад стабільнасці. І не мне вам казаць, што Каўказ — гэта цэлая сістэма сасудаў, якія звязаныя паміж сабою. І наводзіць тут парадак — сізіфава праца.

• А як упісваецца ўзмоцненая актыўнасць тэрарыстаў на Каўказе ў прэзідэнцкія выбары на Украіне? Ледзь не забілі Еўкурава ў Інгушэціі, там жа сёння забіты міністра будаўніцтва, у Чачні праваабаронцаў забіваюць, як сабак, у Дагестане ўвесь час страляюць. Мая думка — такімі крывавымі ўколамі ўвагу Расіі адцягваюць ад чагосьці больш важнага, у тым ліку ад украінскіх выбараў.

• Сёння, 12 жніўня, невядомыя ва ўпор расстралялі ў службовым кабінеце міністра будаўніцтва Інгушэціі. Вось дык так! Баевікі пачалі ўрывацца ў будынкі, якія ахоўваюцца. Што казаць пра мясцовых жыхароў?.. Вайна пачалася або працягваецца? Хаця ёсць версія, што забойства звязанае з пачаткам аўдытарскіх праверак на будоўлях рэспублікі.

• Нас чакае вайна. Мне страшна.

• Я фігею ад навінаў. На Каўказе не ўсё спакойна. Або пачаўся перадзел улады ў рэспубліках, або Масква сапраўды губляе кантроль над рэгіёнамі. Забойства. Забойства. Забойства. І дзе ж логіка? Дзе каўказскае братэрства? Адна справа, забіваць чужых, іншая — сваіх. Адна справа — кроўная помста. Другая — заказныя забойствы, якія носяць відавочна палітычны характар. Рэальна Інгушэція і Дагестан зараз падобныя на Піцер 1990-х гадоў.

• А можа, усё ж гэта сімптом стабілізацыі? Атрымалі бонусы, цяпер дзеляць. Першапачатковы перадзел капіталу ідзе ў рэспубліках. А Маскве ўсё роўна, хто з горцаў застанецца, паколькі ўсіх некамфортных для сябе махмудаў яна сама даўно адстраляла.

• Пуцін прыйшоў, калі ўвесь каўказскі рэгіён закіпаў. Адна з самых важных перадвыбарчых мэтаў была барацьба з тэрарызмам і ліквідацыя выбухованебяспечнай абстаноўкі ў рэгіёне. 10 год прайшло — праз дзень выбухі, абстрэлы, забойствы ў Чачні, Дагестане, Інгушэціі. Што-небудзь змянілася? Нешта змянілася. Сёння прыйшла навіна пра тое, што самы багаты чалавек Расіі Міхаіл Прохараў збіраецца набыць італьянскі футбольны клуб «Рома». Іншымі словамі, за 10 год Абрамовіч і Прохараў ператварыліся ў мільярдэраў, уладальнікаў замежных клубаў за кошт нашага з вамі нікелю і нафты.

• Спецслужбісцкая вежа Крамля зацікаўленая ў дэстабілізацыі на Каўказе для «распілу» сродкаў, якія ідуць з бюджэту на адбудову рэгіёну, на падтрыманне стабільнасці. Ім трэба, каб прыблізна 50 баевікоў сядзелі ў гарах стралялі і забівалі. А на Кадырава ім лёгка сабак вешаць — рэпутацыя ў яго такая. Ён дзікун, непісьменны, забойца і г.д.

• Усё гэта набывае больш-менш зразумелыя контуры толькі ў адным выпадку. На Каўказе ідзе праца па стварэнню перадумоў для пачатку чарговай вайны.

• Нягледзячы на крызіс, Пуцін інвестуе на падтрыманне сваіх марыянетак. Ва ўмовах нарастаючага беспрацоўя ён паведаміў пра дадатковае выдзяленне Інгушэціі за кошт расійскіх падаткаплацельшчыкаў 4,55 мільярда рублёў. Між тым, бюджэт Інгушэціі на 90 працэнтаў фармуецца з федэральных субсідый, або грошай рускіх. Інгушэція займае адно з першых месцаў у Расіі па колькасці афіцыйных беспрацоўных. І адно з першых месцаў па колькасці пабудаваных асабнякоў.

• Інгушэція — гэта прытулак зла. Яна апраўдвае свой статус. Чачня. Дагестан. Гэта быў толькі пачатак. Інгушэція даказала, што баевікі нават у стадыі агоніі мабілізаваліся і вырашылі нанесці, магчыма, апошні ўдар. Статыстыка замахаў дасягнула нябачных вышынь. Працягваецца Другая Каўказская ці пачалася Трэцяя?

• Адным словам, нас чакае рэспубліка Ічкерыя, Дагестан… пасля Рэспубліка Разань, Рэспубліка Паволжская, Незалежная Федэратыўная Рэспубліка Рублёўка, Садовае Кальцо, Масковія са сталіцай Нью-Лужкі.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ЛЕШЭК МІЛЕР

Былы прэм'ер-міністр Польшчы ад партыі «Саюз левых дэмакратаў» заняў вельмі арыгінальную пазіцыю ў адносінах да інцыдэнту на польска-ўкраінскай мяжы. Польскія памежнікі адмовіліся прапускаць праз кардон групу ўкраінскай моладзі — удзельнікаў веласіпеднага прабегу «Еўрапейскімі шляхамі Бандэры», хаця тыя і мелі візы. Фармальная падстава — адсутнасць нейкіх дадатковых дакументаў. А напярэдадні вядомы ў Польшчы ксёндз Ісаковіч-Залескі накіраваў у пракуратуру і МЗС патрабаванне не пускаць веласіпедыстаў у краіну. У Польшчы імя Бандэры звязваецца з генацыдам палякаў на Валыні, палітычным тэрорам і супрацоўніцтвам з Абверам. Інцыдэнт меў вялікі рэзананс. Левыя і прарасійскія партыі Украіны віталі рашэнне Варшавы. На іх думку, МЗС Украіны зрабіў бы гэтак жа, як і польскі, калі б маладыя палякі задумалі велатур «Украінскімі шляхамі Пілсудскага». Польская ліберальная прэса («Gazeta Wyborcza») у сваю чаргу лічыць, што скандал толькі на руку Маскве. Газета заклікае бакі не размаўляць на мове нянавісці. А вось Мілер усю адказнасць пераклаў на прэзідэнта Качыньскага і прэм'ера Туска. Яны, на яго думку, доўгі час заплюшчвалі вочы на спробы Юшчанкі рэабілітаваць радыкальных нацыяналістаў. У выніку і атрымалі на сваю галаву велапрабегі кшталту «Еўрапейскімі шляхамі Бандэры».

### АСКАР БАРАХЛІНАЎ




Дэпутат гарадскога савету Паўладару (Казахстан) замахнуўся на Джаан Роўлінгз, аўтарку вядомага "Гары Потэра". Аскар падаў на брытанскую пісьменніцу ў суд, абвінавачваючы яе па дзесяці пунктах казахскага КК, у тым ліку ў стварэнні арганізаванай злачыннай групоўкі, прапагандзе расавай дыскрымінацыі, вытворчасці наркотыкаў, друку фальшывых грошаў і нават у кантактах з міжнародным тэрарызмам. «Падчас навучання ў магічнай школе ён (Потэр) вучыцца рабіць выбухі і падпалы, пазбаўляць памяці і г.д. А колькі раз Потэр і яго сябры ўжываюць сметанковае піва, віно, медавуху... Магічная школа падобна на лагер па падрыхтоўцы тэрарыстаў у Афганістане, прафесар Дамблар — на Усаму бен Ладэна, чароўная палачка — на аўтамат Калашнікава. Ідэя падзелу людзей на магаў і чараўнікоў — тыповы расізм, — сцвярджае дэпутат у казахскай прэсе. — Потэр — небяспечны суб'ект, з якім лепш не сутыкацца». Калі віна пісьменніцы будзе даказаная, па казахскіх законах, ёй пагражае прыкладна 50 год турмы. Гэта, натуральна, малаверагодна. А вось яе творы і фільмы, знятыя па іх матывах, могуць забараніць, калі казахскія суддзі прызнаюць, што яны сапраўды прапагандуюць усё згаданае вышэй. Увогуле, хутчэй за ўсё, гэта своеасаблівы піяр Барахлінава.

### СІЛЬВІА БЕРЛУСКОНІ




72-гадовага прэм'ер-міністра Італіі падазраюць у рэгулярных стасунках з прадстаўніцамі самай старажытнай прафесіі і нават тынейджэрамі. У такую цяжкую хвіліну на дапамогу Сільвіа нечакана прыйшла яго дачка Барбара. Яна дала інтэрв'ю часопісу «Vanity Fair», у якім заявіла, што знаходзіцца ў захапленні ад таго, як яе бацька знаходзіць агульную мову з моладдзю. Акрамя таго, яна выказала незадавальненне журналістамі, якія палітызуюць прыватнае жыццё Берлусконі. На правакацыйнае пытанне, што яна думае пра раман Сільвіа з 18-гадовай Леціцыяй Наомі, Барбара адказала: «Мяркую, гэта больш псіхалагічная сувязь. У мяне не было такога досведу». Яна таксама падзялілася думкамі наконт разводу яе бацькоў пасля скандалу з Леціцыяй. Барбара лічыць, што канфлікт у сям'і выкліканы доўгім тэрмінам шлюбу, які цягнуўся аж 30 год. Акрамя таго, Барбара, як сястра Элеанора і брат Луіджы выступілі з калектыўнай заявай супраць апазіцыйнай Партыі дэмакратаў, якая правяла апошнюю выбарчую кампанію пад лозунгам: «Вы хацелі б, каб вашых дзяцей выхоўваў Берлусконі?» Дзеці Сільвіа ў адказ кажуць, што менавіта дзякуючы бацьку яны зразумелі сэнс сямейных каштоўнасцяў.

▸ РАЗВАЖАННІ

# БЕЗ ГУСАРАЎ: АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ «СЛАВЯНКА»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**З 10 па 16 ліпеня ў Віцебску прайшоў XVIII фестываль мастацтваў «Славянскі базар». Сёлета мерапрыемства было як ніколі маштабным: яно стала сустрэчай 5 тысяч артыстаў і 100 тысяч гледачоў. Гатэлі горада былі забітыя пад завязку, частку ўдзельнікаў сялілі ў Оршы. На вуліцах значна часцей, чым у мінулыя гады, можна было пачуць замежныя мовы. Удзел у свяце яднання ўсіх славян узялі прадстаўнікі 17 краінаў, сярод іх — «славяне»-бразільцы і «славяне»-в'етнамцы. Але святам мастацтва старая добрая «Славянка» стала далёка не для ўсіх.**





Праз тыдзень пасля заканчэння дзейства Віцебск напоўнены аўрай правінцыйнага мястэчка, якое толькі што пакінулі гусары. У па-новабеларуску чыста падмеценых вуліцах і выдраеных фасадах адчуваецца эмацыйна-фізічная спустошанасць. Свята-Успенскі кафедральны сабор Віцебска — копію уніяцкага храму, шэдэўра архітэктуры XVIII стагоддзя, які зноў паўстае на стромым беразе Заходняй Дзвіны, накрылі купаламі, што адразу вярнула гораду вертыкальную дамінанту, а велічныя муры сабору, яшчэ не атынкаваныя і не пафарбаваныя ў штосьці па-новабеларуску ярка-вясёлкавае, надалі наваколлю нейкую, не пабаюся гэтага дыскрэдытаванага слова, славянскую гатычнасць. Але падчас шпацыраў па постфестывальным Віцебску не пакідае адчуванне: шыкоўныя барокавыя саборы, старажытныя вежы, якія цягам апошніх год тут рупліва ўзнаўлялі, — усяго толькі арыгінальны заднік летняга амфітэатру. Гэтая дзяўчына харошыцца, каб выйсці замуж. За гусара.

Зусім іншы дух пануе на супрацьлеглым, ніжэйшым баку Дзвіны, у былых габрэйскіх кварталах, якія прымыкаюць да віцебскага аўтавакзала. Тут нарадзіўся Шагал, тут працаваў Малевіч — і дух мастацтва, паспеўшы за савецкім часам амаль цалкам адсюль выветрыцца, пакрысе зноў запаўняе ціхія цагляныя вуліцы. Раз-пораз святло выхоплівае з паўзмроку сутоння парасоны ўтульных кавярань, а з гарышча неасветленых старых камяніцаў чуецца жывая музыка. У гэтым квартале адчуваецца патэнцыял такіх нефармальных раёнаў еўрапейскіх гарадоў, як Казімеж у Кракаве ці Нойштадт у Дрэздэне. Але не будзем прыспешваць падзеі… Надвячоркам тут і так хараша.

Гэтак жа, як густая, ярка ўбраная, асветленая правабярэжная частка Віцебску і сціплая ўцёмная, але густоўная і ўтульная левабярэжная яго частка, розніцца жыхары гораду і іх стаўленне да святочнага тыдня. На афіцыйным сайце фестывалю «Славянскі базар» жартуюць: год у Віцебску пачынаецца не ў студзені, а ў ліпені. П'яна-разгульна-запамарочны стан, вядомы кожнаму, хто хоць раз трапляў у Беларусі на Дзень хоць якога гораду, доўжыцца ў Віцебску ажно тыдзень. Для старэйшых гэты тыдзень — магчымасць атрымаць ад прафсаюза бясплатны квіток на канцэрт эстрады, для маладзейшых — шанец пабачыць на вуліцах зорак, знаёмых па экранах тэлевізара, і нагода для штодзённых дыскатэк, для гандляроў і мастакоў — спосаб добра зарабіць.

Другая — меншая частка — дэманстратыўна адхрышчваецца ад усяго, што адбываецца ў горадзе, які ператвараецца ў постсавецкую сталіцу папсы і безгустоўшчыны. Аднак не заўважаць «базару» ў гэтыя дні проста немагчыма. І таму нараджаецца трэцяе, кампраміснае стаўленне да фестывалю: калі зло немагчыма прадухіліць, трэба расслабіцца і атрымліваць асалоду.

Віталь Броўка нарадзіўся ў Сянне, вучыўся ў Наваполацку і ўжо чатыры гады жыве ў Віцебску. Дырэктар рэкламна-канцэртнай агенцыі «Кастусь-media», займаецца моладзевымі праектамі, адзін з іх — гарадскі культурніцкі партал *vitebsk4.me*. Я гутару з ім пра яго адчуванне «славянаў» і «Славянкі».



Віталь Броўка

***— Як 18 год фестывалю змянілі Віцебск і яго жыхароў?***

— Трэба прыгадаць, што сваімі каранямі «Славянка» сягае яшчэ ў «сімвал савецка-польскай дружбы» — фестываль польскай песні, які праходзіў у 1980-я гады ў Віцебску. На той час гэта была даволі прагрэсіўная з'ява, бо ў яшчэ савецкі, наменклатурны Віцебск прыязджалі маладыя творчыя калектывы з Польшчы, дзе ў той час была больш развітая культура: адчуваліся заходнія ноткі, уплыў року нават на саўкова-афіцыйную сцэну. Фестываль быў малады па ўзросце ўдзельнікаў, у тым ліку з беларускага боку. Нашыя актыўна тусаваліся з палякамі, і шмат якіх павеваў набіраліся менавіта ад іх. Мне здаецца, «польская песня» мела разнявольваючы ўплыў на віцьбічаў. Потым — у першыя гады незалежнасці — фестываль называўся «Славянскі кірмаш». Пазней здарылася крыза, а за Лукашэнкам, года з 1995-га, фестываль пачаў атрымліваць тую наменклатурна-папсовую сутнасць, якую мае зараз.

Апошнім часам прагрэсіўная публіка ставіцца да фестывалю даволі негатыўна. Напярэдадні фестывалю на інтэрнэт-форумах можна сустрэць запісы: «Бывайце, я з'язджаю за горад, бо не магу знаходзіцца ў гэтым гармідары. Хто са мной на шашлыкі? У Віцебску няма чаго лавіць». Тым больш, што ў мінулым годзе і сёлета панавала антытэрарыстычная істэрыя: калі ўвесь горад застаўлены міліцэйскімі пастамі з сабакамі, турнікетамі і металашукальнікамі, калі ў цэнтр не прапускаюць пешаходаў з бутэлькамі вады, паўстае процьма нязручнасцяў чыста побытавага характару.

***— Ці былі вы ў горадзе сёлета падчас фестывалю, і калі былі, то якія мерапрыемствы наведалі?***

— Кожны год падчас фестывалю я застаюся ў Віцебску. Мы з таварышамі імкнёмся зрабіць імпрэзы, на якіх цікава бавіць час людзям з альтэрнатыўнымі густамі, дзе яны, так бы мовіць, маюць магчымасць схавацца ад усяго, што адбываецца ў межах афіцыйнай праграмы фестывалю. Мы ладзім канцэрцікі ў закрытых клубах ці электронныя вечарынкі. Сёлета з 11 па 16 ліпеня супольна з аргкамітэтам вялікага ўкраінскага джазавага фэста *Koktebel Jazz Festival* у нас праходзіла «прэ-паці» гэтага фэста, якое адначасова было адборачным турам для беларускіх гуртоў. Гэта была супраца Алега Ціханава, дырэктара гурта «Osimira» і нашага культурніцкага парталу vitebsk4.me. У бітлз-клубе «*Чердачок*» выступалі «*CHERRYVATA*», «*Testamentum Terrae*», «*Хуткі смоўж*», «*Open Space*», «*Серебряная свадьба*», «*Джамбибум*», «*Port Mone*», віцебскі джаз-квартэт «*Espresso*», «Фляус и Кляйн» з Наваполацку…

***— То бок, найлепшыя беларускія альтэрнатыўныя гурты…***

— І яшчэ гурт «Mamanet» з Украіны. Кожны дзень «Славянкі» ўвечары можна было знайсці паратунак ад папсовай пагулянкі, прытулак сярод аднадумцаў, тых, хто любіць добрую музыку.

***— Ці пазіцыянаваўся ваш праект як частка фестывальнай праграмы?***

— Не, хаця інфармацыю пра яго можна было знайсці ў навінах пра «Славянскі базар». Гэта адбывалася паралельна. Мы вырашылі, што цікава будзе стварыць невялічкую прастору для вольнага мастацтва.

***— Што з падзеяў «Славянскага базару», на ваш погляд, варта таго, каб бачыць гэта на ўласныя вочы, а не на экране тэлевізара? А чаго, магчыма, там і не пабачыш?***

— Заўсёды ёсць цікавыя выспачкі ў "Горадзе майстроў", хоць з кожным годам іх усё складаней заўважыць сярод агульнага кітайскага шырспажыву. Сёлета там адбываўся фэст старажытнай культуры, які ладзілі прадстаўнікі клубу сярэднявечнай рэканструкцыі "Паўночная вежа". Гэта была падзея, што выбівалася з астатняга лубочнага мастацтва, якое дэманструецца пад выглядам народнага падчас "Славянскага базару".

***— Пасля таго, як за Амстэрдамам замацавалася слава сталіцы марыхуаны і свабоднага кахання, туды з усяго свету сталі перасяляцца людзі, схільныя да адпаведнага стылю жыцця. Парыж традыцыйна вабіць рамантычныя парачкі ды моднікаў, Прага — аматараў піва. Ці можна сказаць, што насельніцтва Віцебска папаўняецца за кошт аматараў папсы?***

— Я б не сказаў. Разгул папсы ў нас адчуваецца мацней, чым у астатняй Беларусі, адно раз на год. Віцебск традыцыйна лічыцца горадам мастакоў, іх сапраўды ў горадзе шмат, у кожнага месціча ёсць знаёмы мастак, ці не кожны бываў у майстэрні мастака, кожны віцьбіч ведае, што тут працавалі Шагал, Пэн і іншыя. Віцебск мае перспектыву стаць сапраўднай культурнай сталіцай Беларусі, хоць на дадзены момант гэта далёка не так. На жаль, найгучнейшую падзею ў віцебскай культурнай прасторы назваць культурай даволі цяжка. Умоваў для культурнага росквіту няма. Але ёсць перспектывы, ёсць таленавітая моладзь.

***— Што б вы змянілі ў канцэпцыі «Славянскага базару», калі б былі яго арганізатарам?***

— Любое масавае, маштабнае мерапрыемства непазбежна будзе мець папсовае напаўненне. Але сучасны кічавы фармат — віна зусім не арганізатараў. Я меў магчымасць параўнаць сёлетнюю праграму, прапанаваную дырэкцыяй фестывалю, і праграму, якую адцэнзуравалі і зацвердзілі ў Мінкульце — гэта дзве розныя праграмы: першая была прагрэсіўнейшай. Я лічу, любы вялікі фестываль павінен быць дэмакратычным, улічваць эстэтычныя запатрабаванні самых розных гледачоў. Ідэал — фестываль фестываляў, кірмаш самых розных культурных фарматаў.

РЭСТЫТУЦЫЯ

# ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

Юры ХАДЫКА, прафесар

**Спадзяюся, што Васіль Уладзіміравіч Быкаў дараваў бы мне гэты бяскрыўдны плагіят. Бо яшчэ больш доўгімі, чым жыццё чалавека, бываюць дарогі вяртання помнікаў гісторыі і культуры. "Рэстытуцыя" — лацінскае слова, што перакладаецца як "вяртанне". Ужываецца ў грамадзянскім і міжнародным праве.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Юры Хадыка

У гэтым кантэксце зараз гаворка часцей за ўсё ідзе пра вяртанне артэфактаў, вывезеных з краіны па праву моцнага. А значыць незаконна. Парадак рэстытуцыі ўнармаваны адносна нядаўна, пасля другой сусветнай вайны. Але выпадкі масавай рэстытуцыі адбываліся і раней. Так, пасля паразы ў польска-савецкай вайне 1920 года Масква мусіла вярнуць Варшаве вялікую колькасць мастацкіх каштоўнасцей і пісьмовых помнікаў, вывезеных пасля знішчэння Рэчы Паспалітай.

Палякі забіралі ўсё, што было звязана з тэрыторыяй на захад ад нядаўна ўсталяванай польска-савецкай мяжы. Гэта значыць, крыху на захад ад Мінска. Так у Музеі войска польскага апынуліся вылітыя ў Нясвіжы гарматы, і нават сцяг з Пагоняй паўстанцаў Кастуся Каліноўскага.

Аднак гэта прыклад рэстытуцыі з пазіцыі сілы. Чым слабейшыя маюць магчымасць вярнуць свае каштоўнасці. Грэцыя і Егіпет вяртаюць свае помнікі з Лондана і Берліна. Хутка гэтым зоймецца і Ірак, а таксама плойма новых дзяржаў, што ўтварыліся пасля распаду СССР і Югаславіі. Трэба не спазніцца, бо працэдура рэстытуцыі складаная, а былыя метраполіі робяць усё, каб пакінуць артэфакты сабе.

Вось колькі прыкладаў. На свае вочы бачыў у Эрмітажы шыкоўна ўпрыгожаную шаблю з подпісам: «Шабля польскага магната Льва Сапегі». І гэта пасля масавай рэстытуцыі пачатку 20-х гадоў! Ці палякі прапусцілі такі каштоўны экспанат? Але ніякай загадкі ці памылкі тут няма. Проста ў тыя часы эксперты абодвух бакоў ведалі, што Сапегі паходзілі з магнатаў рускай часткі Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Што сам Леў Сапега палякам сябе не лічыў. Таму Масква і не аддала шаблю Варшаве. А эрмітажны подпіс быў зроблены наўмысна, каб ні летувісы, ні беларусы на яе не прэтэндавалі. Але сітуацыя не безнадзейная. Паколькі Сапега не паляк (інакш шабля даўно была б у Варшаве) і не маскаль (пра што сведчыць подпіс), то Беларусь мае права прэтэндаваць на яе.

Са свайго боку Масква настойліва шукае бурштынавы пакой, вывезены немцамі падчас вайны з аднаго з пецярбургскіх палацаў, і разам з тым прыняла закон ужо пасля распаду СССР, які абцяжарвае вяртанне ў Еўропу мастацкіх рарытэтаў, набытых у якасці вайсковых трафеяў.

Днямі адбыўся пяты з'езд Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Яго тэмай была праблема фармавання і паглыблення самаідэнтыфікацыі беларусаў. Добра вядома, як хутка расцярушваецца новая беларуская эміграцыя ў іншамоўным асяродку за мяжою. І найбольш яе хвалюе праблема прэферэнцый пры перасячэнні мяжы, пакуль чалавек памятае, што ён з Беларусі. Таму прадстаўнікі старой паваеннай эміграцыі заўсёды падкрэслівалі асаблівую ролю роднай мовы ў захаванні беларускай ідэнтычнасці.

Аднак гэтым разам гаворка не абмяжавалася толькі лінгвістычнай праблемай. Хаця трэба быць чыноўнікам беларускага міністэрства адукацыі, каб на чыстым воку сцвярджаць, што з беларускай адукацыяй у нас усё добра. І больш за 1400 беларускамоўных школ, і кожны студэнт мае права слухаць лекцыі на роднай мове. А мова памірае на вачах.

Безумоўна, мова — неабходны складнік самаідэнтыфікацыі. Але недастатковы. Толькі ў вельмі прымітыўных грамадствах мова з'яўляецца адзіным інструментам яднання людзей. Нават у цемнаскурых плямёнаў Афрыкі акрамя агульнай мовы былі яшчэ агульныя вераванні. А чым больш цывілізаваная краіна, тым большую ролю ў самаідэнтыфікацыі яе грамадзян адыгрывае культура і гістарычная памяць. На жаль, з гэтымі аспектамі нацыятворчасці справы ў нас зусім не бліскучыя.

Яшчэ нядаўна, за савецкім часам, у энцыклапедыях пісалі, што расійская нацыя склалася ў трынаццатым стагоддзі, а беларуская — у шаснаццатым. Гэта было прымітыўным абгрунтаваннем тэорыі старэйшага брата. Беларускі народ увесь час пакутаваў пад сацыяльным і нацыянальным прыгнётам то літоўскіх, то польскіх феадалаў. І толькі расійскія палкі вызвалілі пакутнікаў. Пра якую беларускую культуру, акрамя фальклору, у такіх умовах можна было казаць?

Зараз усе ведаюць, што гэта — хлусня. Толькі што яе абвяргае акрамя слоў? Наша літаратура адносна маладая. Ёй не больш за 150 гадоў. Твораў на гістарычную тэматыку мала. У рэлігійных адносінах народ расколаты. Каталікі толькі нядаўна перайшлі ў набажэнстве на беларускую мову. А праваслаўны клір працягвае русіфікацыю. Дваццаць гадоў біблейная камісія перакладае тэкст Бібліі на беларускую мову! І канца гэтай працы не бачна. Святыя Кірыла і Мяфодзій хутчэй стварылі пісьменнасць для непісьменнага народа і пераклалі з грэчаскай мовы не толькі Біблію, але і ўвесь корпус літургічных тэкстаў.

Застаюцца толькі музеі. Жывыя артэфакты, што сведчаць пра высокую культуру і слаўную гісторыю, пераконваюць нават глуханямых. Але нашы музеі бедныя. За стагоддзі каланіяльнай залежнасці Беларусь згубіла большасць сваёй архітэктурнай спадчыны і ўсе скарбы магнацкіх калекцый. А нашы продкі разумелі і цанілі сілу і каштоўнасць матэрыяльнага факта. Таму Радзівілы, Сапегі, Пацы, Хадкевічы, Агінскія ды іншыя збіралі і захоўвалі і гістарычныя дакументы, і партрэты продкаў, каралёў і вялікіх князёў, і старажытную зброю, і мастацкія творы сваіх і замежных мастакоў. Гэтыя зборы былі канфіскаваныя царскім урадам за ўдзелы ў паўстаннях альбо падараваныя самімі гаспадарамі ў Кракаў, падалей ад хцівага Пецярбурга. Апошняй была перададзена Варшаве пасля другой сусветнай вайны нясвіжская калекцыя партрэтаў. І толькі невялікая іх колькасць засталася ў Беларусі і стала экспанавацца пасля 1991 года.


Нясвіжскай калекцыі. Выява з: minpraud.by



Крыж Ефрасінні Полацкай

Застаецца рэстытуцыя. Нельга, па вобразнаму выразу А. Лукашэнкі, ляцець на адным крыле. Самаідэнтыфікацыя не можа грунтавацца выключна на моўнай праблеме. Яе неабходна падмацаваць, падперці жывымі рэальнымі артэфактамі, сабраўшы іх са сховішчаў нашых суседзяў. Гэта нялёгкая задача. Толькі агульнымі намаганнямі грамадскасці і дзяржструктур яе можна вырашыць.

Як бы выйграла наша Нацыянальная бібліятэка, калі б Масква Мінску, а не Вільнюсу передала Літоўскую метрыку! Ніводзін лінгвіст — ні расійскі, ні летувіскі — не дакажа, што сучасная летувіская мова паходзіць ад мовы Літоўскай метрыкі. Не дарма ж старажытныя гаварылі: «Чыя мова, таго і зямля». А тым больш твор, напісаны на гэтай мове.

Таксама неабходна дамагацца вяртання Радзівілаўскага летапісу, упрыгожанага больш як 500-мі ілюстрацыямі. Ён быў захоплены пераможцамі ў Кёнігсбергу, куды яго завёз Багуслаў Радзівіл, уладальнік Слуцка, пасля «невядомай вайны» (1654–1667 гг.), ажаніўшыся з прускай прынцэсай.

Бясспрэчна, што павінны быць вернуты з Санкт-Пецярбургу Архіў уніяцкіх мітрапалітаў, вывезены з Жыровічаў пасля ліквідацыі Уніі. Расіяне не вывучалі і ніколі не будуць яго вывучаць. Калі архіў не вярнуць, ён калінебудзь загіне там ад паводкі ці пажару.

Беларусь — бліжэйшая саюзніца Расійскай федэрацыі. Будуе з ёй саюзную дзяржаву. Гэта і ставарае рэальную падставу для выпраўлення гістарычнай несправядлівасці, у выніку якой бясцэнныя помнікі Беларусі апынуліся ў сховішчах саюзніцы.

«Рэстытуцыя» гучыць падобна да слова «рэстаўрацыя». І блізкая ёй па сэнсу. Але калі пры рэстаўрацыі дапушчальна часам выкарыстоўваць сучасныя матэрыялы, каб захаваўшы вонкавы выгляд, прыстасаваць архітэктурны помнік для сучасных патрэбаў, то выраб копій, макетаў, муляжоў зніклых артэфактаў не з'яўляецца рэстытуцыяй і не замяняе яе. Так здарылася з копіяй крыжа Ефрасінні Полацкай. Новы крыж не замяніў і не мог замяніць зніклай святыні. Гэты наватвор можна называць крыжам мітрапаліта Філарэта, які прывёз з Палесціны для яго святыя рэліквіі. А пошукі сапраўднага крыжа святой Ефрасінні трэба настойліва працягваць. І шукаць яго найперш у скарбніцах Маскоўскага патрыярхату.

▸ АДУКАЦЫЯ

# ПЕРШЫЯ БАКАЛАЎРЫ Ў ВЫГНАННІ

Юлія СНЕГ

**У Еўрапейскім гуманітарным універсітэце адбылося ўрачыстае ўручэнне бакалаўрскіх дыпломаў. 113 выпускнікоў ЕГУ сталі першымі ў «віленскай» гісторыі універсітэта пасля яго закрыцця ў Мінску.**

Ва ўрачыстым звароце да гасцей і ўдзельнікаў цырымоніі рэктар ЕГУ акадэмік Анатоль Міхайлаў распавёў пра цяжкасці, з якімі універсітэт сутыкнуўся, аднаўляючы сваю працу ў Літве:

«Найноўшая гісторыя ведае няшмат выпадкаў закрыцця цэлага універсітэта, — падкрэсліў ён. — Гэта адбылося 5 гадоў таму паводле палітычных матываў. Нам прад'явілі абсурдныя абвінавачанні ў тым, што мы рыхтуем эліту, каб прывесці Беларусь у Еўропу. Тым самым наша еўрапейскае мінулае, наша еўрапейская прыналежнасць, якая здавалася нам актуальнай і відавочнай пасля набыцця Беларуссю незалежнасці ў пачатку 90-х, аказалася пад сумневам і неўзабаве стала ўспрымацца небяспечнай».

Пачаць усё ab ovo стала магчымым дзякуючы шырокай падтрымцы звонку. Ад імя універсітэта Анатоль Міхайлаў выказаў словы ўдзячнасці былому прэзідэнту Літвы Валдасу Адамкусу, Савету міністраў Паўночных краін, Еўрапейскай камісіі і Еўрапарламенту, урадам краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Сёння, па словах дэкана бакалаўрскай школы Рыгора Міненкова, універсітэт ставіць перад сабой шмат новых задач і бачыць новыя перспектывы. У прыватнасці, апошнім часам адбыўся шэраг перамоў з іншымі еўрапейскімі ВНУ наконт пашырэння супрацоўніцтва ў сферы абмену студэнтамі, удзелу іх у міжнародных студэнцкіх праграмах.

Праблемай, у сваю чаргу, можна назваць тое, што сёння з Беларусі прыязджае вучыцца моладзь, якая далёка не заўсёды адпавядае еўрапейскім стандартам пачатку вышэйшай адукацыі. Прычына палягае ў тым ліку і ў рэформе школьнай адукацыі, якая паспрыяла зніжэнню ведаў замежных моў. А іх веданне — норма для Еўропы. Колішнія абітурыенты, якія навучаліся ў Мінску, прыходзілі ва універсітэт больш падрыхтаванымі.

З іншага боку, балонская сістэма адукацыі, паводле якой працуе Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, дае магчымасць усім, хто жадае, праявіць свае таленты і здольнасці адпаведна магчымасцям еўрапейскай адукацыі, уключыць працавітасць «на поўны» і атрымаць вельмі высокія вынікі.



Маладыя бакалаўры



Экс-прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус і рэктар ЕГУ Анатоль Міхайлаў

Віншуючы выпускнікоў, Рыгор Міненкоў падкрэсліў, што сённяшнія бакалаўры «назаўсёды застануцца першымі» ў новай гісторыі ЕГУ. І пажадаў заўсёды памятаць, што «ЕГУ — не проста ВНУ, гэта і лад думак, і лад жыцця».

Пра дух універсітэта, якім насычана атмасфера тут, кажуць і самі выпускнікі. Адзін з бакалаўраў паліталогіі распавядае пра розніцу ўспрыняцця тэорыі і практыкі паліталогіі ў выпускнікоў ЕГУ і Беларускага дзяржуніверсітэта. «Мы заўсёды спрачаемся, таму што ў нас прынцыпова рознае бачанне праблем і выйсця з іх. Выпускнікі БДУ разумеюць так: ёсць адзіны слушны падыход, а ўсё астатняе — нясслушна. А мы сыходзім з таго, што ёсць рэальнасць, і яна такая, як ёсць. Усе яе праявы — натуральныя. То бок, нас вучылі не абмяжоўваць сябе нейкімі тэарэтычнымі правіламі, бо трэба вывучаць сітуацыю шматбакова».

На думку майго суразмоўцы, балонская сістэма адукацыі спрыяе тым, хто прыехаў вучыцца і шукаць дарогу для сябе далей, вызначацца, што табе цікавей і дзе ты можаш быць больш паспяховым. «Важна, што я магу зрабіцца спецыялістам не ў адной галіне, а ў некалькіх. Я стаў бакалаўрам паліталогіі, а наперадзе ў мяне — праца па шэрагу іншых праграм. Ужо сёння я маю прапановы працы ў Беларусі і не ў Беларусі, магу выбіраць». Але, падкрэслівае выпускнік, «сёння шмат тых, хто прыязджае ў ЕГУ, едзе больш за еўрапейскімі краявідамі, бачыць каштоўнасць не ў сутнасці адукацыі тут, а ў краіне яго размяшчэння».

Ва ўрачыстасці ўручэння дыпломаў першым бакалаўрам ЕГУ ў Вільне прымаў удзел экс-прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус. Ён выказаў надзею, што выпускнікі ЕГУ здолеюць стаць «будаўнікамі новай дэмакратычнай і свабоднай дзяржавы Беларусь».

▸ ФЭСТ

# СВАБОДА, ЯКАЯ ЯДНАЕ

**Рок-фэст «Be Free» сёлета пройдзе 22–23 жніўня ў Чарнігаве. Яго арганізатары — Беларуская музычная альтэрнатыва, Ініцыятыва «Студфармат» і Еўрапейскае радыё для Беларусі — запрасілі на фестываль 20 маладых і вядомых гуртоў з Беларусі, Украіны, Польшчы і Францыі.**

Мэта фестывалю — аб'яднаць лепшыя рок-праекты і публіку суседніх краін ідэяй свабоды творчасці і самавыяўлення, а таксама прыцягнуць увагу да сучаснай рок-сцэны Беларусі.

Пляцоўкай для фестывалю выбрана маляўнічая мясціна між Цэнтральным гарадскім паркам культуры і адпачынку і турыстычным комплексам, у які ўваходзяць гатэлі «Бранск», «Прафсаюзны» і «Прыдзеснянская». Менавіта там на беразе Дзясны на працягу двух дзён будуць праходзіць канцэрты. Фестываль не патрабуе ад гледачоў ніякіх выдаткаў, а непадалёку ад сцэны для іншагародніх будзе арганізавана пляцоўка для пражывання ў намётах.

Украіна абрана месцам для сустрэчы прыхільнікаў музычных ініцыятыў рэгіёнаў не выпадкова: грамадзянам з Літвы ці Польшчы для паездкі ў гэтую краіну не патрэбна віза. Паколькі Чарнігаў побач з мяжой Беларусі і Расіі, то гэта прывабіць болей гледачоў. Між іншым, арганізаваць open-air на Украіне значна прасцей, чым у Беларусі.

Хэдлайнерамі гэтага года стануць гурты «Ляпіс Трубецкой» (Беларусь) і «Воплі Відаплясава» (Украіна), да якіх далучацца госці з Польшчы («Zero–85») і Францыі («Vladivostok»), а таксама шэраг моладзевых і вядомых гуртоў з Беларусі: «B:N», «Zatochka», «Tarpach», «Partyzon», «Pomidor/OFF», «LitvinTroll», «Imprudence», «ULIS» і іншыя. Спіс штодня дапаўняецца, і неўзабаве да складу ўдзельнікаў далучацца вядомыя ўкраінскія выканаўцы.

Чарнігаў стаў трэцім горадам, дзе адбываецца «Be Free». Папярэднія фэсты праходзілі ў Луцку і Львове. Сярод іншых у ім прымалі ўдзел такія гурты, як «Гайдамакі», «Тартак» (Украіна), «Neuro Dubel», «Крама» (Беларусь), «Metanoia» (Польшча). Колькасць гледачоў фестывалю дасягала 10 тысяч.

Падтрымліваюць фестываль Чарнігаўскі рок-клуб і Чарнігаўскі грамадзянскі камітэт абароны правоў чалавека, апекуе мерапрыемства таксама і мэрыя горада.

Кантакты для ўсіх жадаючых прыняць удзел у фестывалі:

Сайт http://festsvabody.org

LiveJournal http://fest_svabody.livejournal.com

Vkontakte http://vkontakte.ru/club10165314

Myspace http://myspace.com

e-mail: fest.svabody@gmail.com

Тэлефоны

У Беларусі: +375 29 6490888 (Віталь Супрановіч)

Ва Украіне: + 380 63 789 68 99 (Аляксей Лукашевіч)

+380 95 408 05 60 (Аляксандр Жалязной)

У Польшчы: +48 516 58 88 63 (Марыя Садоўская)

+48 694 716 184 (Слава Корань)

## МЕРКАВАННІ БЫЛЫХ УДЗЕЛЬНІКАЎ «BE FREE»

***Сяргей Міхалок, гурт «Ляпіс Трубецкой»***

— Упэўнены, што можна быць абсалютна вольным чалавекам пры любым таталітарным рэжыме і абсалютна залежным пры самай развітой дэмакратыі. Для мяне воля — гэта, у першую чаргу, адсутнасць залежнасці. Залежнасці могуць быць самыя розныя: алкаголь, наркотыкі, дарагія аўтамабілі, сяброўства з магутнымі асобамі ў свеце, якія табе не цікавы, але «могуць спатрэбіцца», — я ад гэтага ўсяго сумленна адмаўляюся. І, вядома, воля немагчыма без веды. «Perfice te» — «удасканальвай сябе» — вось лозунг продкаў. Чым больш ты ведаеш, тым лягчэй можаш дамагчыся поўнай незалежнасці. Невуцтва — добраахвотнае рабства, а веды — моц і воля.

***Слава Корень, лідар рок-гурта «ULIS»:***

— Для мяне вельмі важна, што ў назве фестывалю ёсць слова «Свабода». Свабода — гэта пазбаўленне ад уласных комплексаў, такіх, як прага ўлады, хцівасць, страх, абыякавасць, нянавісць… Быць вольным можна толькі тады, калі любоў да навакольнага свету, спачуванне, пачуццё роўнасці і ўсясветнай справядлівасці будзе перабольшваць у цябе, і тады ніякая фізічная несвабода цябе не паставіць на калені.

***Алег Скрыпка, «Воплі Відаплясава»***

— Рок-музыка вельмі шчыльна звязана з усведамленнем свабоды. Я лічу, што «Be Free» — някепскі слоган для рок-фестываля, тым болей, што правільна расстаўлены акцэнты, што гэты фестываль проста за свабоду — за свабоду думкі, перамяшчэнняў, свабоду спяваць ці проста мець стасункі. Тут не можа быць ніякага супрацьву.

***Гурт «Vladivostok», Францыя***

— Мы вельмі рады прадстаўленай магчымасці выступаць ва Усходняй Еўропе, бо гэта вельмі адрозніваецца ад таго, да чаго мы прызвычаіліся ў Францыі. У мінулым годзе мы ўдзельнічалі на «Be Free» ў Львове, і былі ў захапленні ад фестывалю. Да сустрэчы на нашым канцэрце!

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 14.08.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.